Трансмалдавія ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Раскопкі ў Дубне ☞ 9

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 36 (2625) Год LI | Беласток, 3 верасня 2006 г. | Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

УСЕ ЎСІМ ПАТРЭБНЫЯ

Міністр Яраслаў Зялінскі сваімі дзеяннямі рашуча павысіў шанс і рэйтынг СЛД і Самаабароны на добры выбарчы вынік сярод беларускай меншасці. За такую рэкламу Ян Сычэўскі пасля выбараў павінен аддзячыць міністру канцэртам найлепшых калектываў у сядзібе БГКТ.

Не моўкне замяшанне пасля таго, як віцэ-міністр унутраных спраў і адміністрацыі Яраслаў Зялінскі адняў датацыю на гэты год і на наступныя два гады Беларускаму грамадска-культурнаму таварыству.

Прыгадаем, што віцэ-міністр Зялінскі пазбавіў БГКТ грошай, палічыўшы, што незаконна выкарыстала яно ледзь не 6 тысяч злотых. Гэтыя сродкі, замест на культурную дзейнасць, былі прызначаны на рамонт лесвіцы ў сядзібе Галоўнага праўлення БГКТ. Тым часам справа БГКТ спадарожнічала святу Праабражэння Гасподняга на Святой Гары Грабарцы. Паявіўся на Спаса віцэ-прэм'ер Анджэй Лепэр. Абяцаў інтэрвенцыю. Мітрапаліт Сава ў сваю чаргу, звяртаючыся да віцэ-прэм'ера, сказаў, што развіццё беларускай культуры ў Польшчы апынулася пад пагрозай. Анджэй Лепэр заявіў:

— Гэта вельмі кепска, што з-за такой невялікай памылкі сустрэла іх такое сур'ёзнае пакаранне. Яны нашы грамадзяне, а рашэнне міністра — непаразуменне.

Некалькі дзён раней зрабілі заяву падляшскі маршалак Януш Кшыжэўскі (на свята Праабражэння Гасподняга ўзнагароджаны мітрапалітам Савам ордэнам Марыі Магдалены) ды старшыня сеймікa Збігнеў Кшывіцкі.

Праблематыка, звязаная з рашэннем віцэ-міністра ўнутраных спраў і адміністрацыі была ўведзена ў парадак апошняга пасяджэння сеймавай Камісіі па справах нацыянальных і этнічных меншасцей. Яе старшыня Яўген Чыквін сказаў „Ніве":

— Дыскусія была бурлівая. Я мяркую, што рашэнне пана Зялінскага было шкоднае. Падобна як у выпадку „Нівы", мабыць, якраз суд павінен высветліць гэтую справу. Калі БГКТ парушыла закон, дык чаму міністр Зялінскі не паведаміў органы правапарадку?

Нечакана, на пачатку кастрычніка, камісія наведае Беласточчыну. Будзе займацца праблемамі, якія нараслі вакол беларускай, праваслаўнай, меншасці.

Як ужо мы пісалі, МУСіА аб'явіла конкурс на рэалізацыю задач, якія маюць служыць падтрымцы культуры беларускай меншасці. У такі спосаб размяркоўваюцца грошы, якія мела атрымаць БГКТ. Заяву на конкурс падало м.інш. Беларускае аб'яднанне студэнтаў. Старшыня Яўген Чыквін сцвердзіў:

— Прыкра, што ў гэтай справе няма сярод беларусаў салідарнасці. Заявы на грошы па БГКТ даюць міністру Зялінскаму алібі. Ён толькі і разлічвае на гэта.

Старшыня Чыквін сумняваецца, ці студэнцкае аб'яднанне ў змозе сарганізаваць такія вялікія мерапрыемствы, якія рабіла БГКТ: Фестываль беларускай культуры, Сяброўскую бяседу ці Купалле.

Старшыня БАС Ілона Карпюк у размове з „Нівай" тлумачыцца:

— Гэта публічныя сродкі. Калі беларуская меншасць іх не выкарыстае, то страціць іх якраз беларуская меншасць.

І дадае:

— Ані БГКТ, ані спадар Чыквін ніколі не былі салідарнымі з нашымі дзеяннямі. Штогод стараемся даказаць, што мы арганізацыйна спраўныя, хоць бы рыхтуючы „Басовішча".

БАС падало заяву на каля 200 тыс. зл. на арганізацыю „Падляшскіх запустаў", юбілею 25-годдзя аб'яднання, этнаграфічную лабараторыю і выданні DVD і CD.

Як сказала нам Данута Главацка-Мазур, выконваючая абавязкі дырэктара дэпартамента меншасцей МУСіА, да мінулага тыдня заявы на грошы па БГКТ падалі дзевяць г.зв. суб'ектаў. Іх заявы складваюць суму каля 300 тысяч злотых (у спадчыне пасля БГКТ засталося 435 тыс. зл.). Міністэрства чакала чарговых заяў яшчэ да паловы гэтага тыдня. Дата падачы заяў на наступны год мінае 15 верасня. Як мы даведаліся, грошы раней прадбачаныя на наступны год на дзейнасць БГКТ міністэрства найахвотней перадало б самаўрадам (дамам культуры і да г.п.), якія былі суарганізатарамі мерапрыемстваў Таварыства. Чыноўнікі гэтага ведамства намаўлялі да гэтага яшчэ... (!) да рашэння віцэ-міністра Зялінскага.

— Маем надзею актывізаваць беларускае асяроддзе, — кажа дырэктар Главацка-Мазур.

Пры нагодзе інфармуем, што Беларускі саюз у РП падаў у МУСіА заявы на сфінансаванне сёлета пяці мерапрыемстваў арганізаваных гадамі (літаратурны семінар „Бязмежжа", літаратурны конкурс для моладзі, сустрэчы ліцэістаў з Бельска-Падляшскага і Гайнаўкі, апеку над калектывам „Маланка", пераклады тэкстаў аб беларускай меншасці на сайце „bialorus.pl"). МУСіА сцвердзіла, спасылаючыся на „меркаванне спецыялістаў", што яны нявартыя дафінансавання, апрача вядзення „Маланкі". Аднак у такой сітуацыі БС у РП адмовіўся ад апекі над калектывам.

Раіна СТЭФАНЧУК

„Добрыя хлопцы" ☞ 2

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Двойчы за апошнія тры гады давялося перажыць налёт (гэта найбольш адэкватнае слова) супрацоўнікаў КГБ. У 2004 годзе апергрупа „дзяржаўнай бяспекі" (двукоссе стаўлю не з іроніі, а адпаведна сутнасці) па надуманых падставах (нібыта ў рамках расследавання адной крымінальнай справы) разграміла рэдакцыю нашага бюлетэню „Свой Лад". Маленькае інфармацыйна-аналітычнае выданне, якое выходзіла на Гродзеншчыне накладам 299 асобнікаў і не парушала аніводнага пункта заканадаўства, аказваецца, уяўляла страшную небяспеку для цэлай дзяржавы!...

Наш Арыент ☞ 8

Міра ЛУКША, Рэната ЧЫЖЭЎСКАЯ

— Калісьці я сюды прыязджала з турыстымі ў якасьці гіда. Экскурсіям не хапала ў Крушынянах месцаў, дзе б можна было спыніцца. Я зачыняла мячэць, бо мела ключ, і мы ехалі далей. А іншыя турысты заставаліся. Турысты ехалі ў Багонікі. Крушыняны паміралі. А тут так прыгожа, тут адчуваецца той Усход, Арыент. Я сама нарадзілася ў Тшцянцы пад Познанню, а ў Крушынянах спачываюць мае продкі, Палтажыцкія. Мне схацелася зрабіць тут месца не толькі для турыстаў, але і для татарскай моладзі — нас няшмат, усе паразʼязджаліся, хоць сувязь усё моцная і хочацца вярнуцца да каранёў...

Віншуем Сакрата Яновіча !!!

Сакрату Яновічу
ў дзень нараджэння
жадаем здароўя,
уцехі, натхнення
(трыццаць гадоў да ста
засталося).
Дык гэта ж пачатак
— вясна, а не восень!

Рэдакцыя „Нівы"

„Добрыя хлопцы”

Двойчы за апошнія тры гады давялося перажыць налёт (гэта найбольш адэкватнае слова) супрацоўнікаў КДБ. У 2004 годзе апергрупа „дзяржаўнай бяспекі” (двукоссе стаўлю не з іроніі, а адпаведна сутнасці) па надуманых падставах (нібыта ў рамках расследавання адной крымінальнай справы) разграміла рэдакцыю нашага бюлетэня „Свой Лад”. Маленькае інфармацыйна-аналітычнае выданне, якое выходзіла на Гродзеншчыне накладам 299 асобнікаў і не парушала аніводнага пункта заканадаўства, аказваецца, уяўляла страшную небяспеку для цэлай дзяржавы! Забралі камп’ютэрную тэхніку, якую, праўда, тады праз тры месяцы вярнулі. Размаўлялі неяк у адной кампаніі пра гэтую гісторыю і пра асобу кіраўніка „групы захопу” падпалкоўніка N. „А, Міша N. — добры хлопец!” — сказаў адзін з прысутных знаёмых. Колькі разоў даводзілася ўжо чуць такія словы.

Роўна праз два гады, дзень у дзень (можа ў іх графік такі!) ужо дзве групы супрацоўнікаў КДБ па аналагічным сцэнарыю ўварваліся не толькі на маё працоўнае месца, але і ў маю прыватную кватэру. Без усялякіх падстаў, па-бандыцку, забралі ўсю камп’ютэрную тэхніку, не пагрэбавалі нават старой клавіятурай (!). „Спецаперацыяй” кіраваў малады хлопец з мілагучным беларускім прозвішчам, якога колькі тыдняў пасля іншы знаёмы ў прыватнай гутарцы таксама характарызаваў як „добрага хлопца”. Тут мне згадваецца адзін стары анекдот з серыі „Ленін і дзеці”. Неяк Уладзімір Ілыч галіў бараду. Наўкола гуртам скакалі і выдурваліся дзеці. Незнарок яны штурханулі дзядулю Леніна і той парэзаўся. Правадыр Ілыч са злосці надаваў дзецям кухталёў і тыя сталі плакаць. А прысутны пры гэтым таварыш па партыі Бонч-Бруевіч (па паходжанні, дарэчы, з беларусаў Магілёўшчыны) глыбокадумна заўважыў: „Дабрэйшай душы чалавек! А мог жа лязом брытвы і па вачах!”

Гэтыя „доблесныя чэкісты” напэўна дома добрыя мужы, сыны і бацькі. І праца іхняя ім падабаецца — адзін шчыра мне ў гэтым прызнаўся. Нічога, што цікуючы за іншадумцамі, праслухоўваючы прыватныя размовы (які агідны занятак для мужчыны!), яны і не задумваюцца, што жывуць нашым коштам. Верагодна, што ў старасці будуць апавядаць унукам як яны гераічна змагаліся з „баевікамі”. Цікава толькі, ці ходзіць хто-небудзь з цяперашняй генерацыі „гэбульнікаў” (дазволена ж) у царкву ці касцёл? Не, не па працы, не па службоваму абавязку, а так — паспавядацца, ачысціць душу, проста ціха ўкленчыць...

Камп’ютэрную тэхніку мне так і не аддалі. І, мяркуючы па бездапаможна-бязглуздых адказах пракуратураў розных роўняў на скаргі, пры гэтай уладзе не аддадуць. Звяртацца ў суд бессэнсоўна, бо ўсё вырашае структура, якая не пільнуецца аніякіх нормаў маралі і аніякіх законаў. І ў яе аснове стаяць „добрыя хлопцы”, кожны паасобку такі добры, а ўсе разам — апрычнікі дваццаць першага стагоддзя, духоўныя нашчадкі сатанінскага НКУС. З-за такіх вось „добрых хлопцаў”, якія зрабілі свой выбар, і вырастаюць таталітарныя антычалавечыя рэжымы, што нішчаць тысячы людзей.

Пішу гэтыя радкі акурат 19 жніўня. Якраз пятнаццаць год таму ў Маскве выбухнуў камуністычны путч. Праз пару дзён ён з трэскам праваліўся. Якая была радасць ва ўсіх нармальных людзей! Але праз кароткі для гісторыі тэрмін, Барыс Ельцын — той, хто змагаўся з рэстаўратарамі камуністычнага СССР, сам перадаў уладу ў рукі рэакцыянераў. Паўзучая гэбісцкая навала накрыла і шматнацыянальную Расію і маладую беларускую дзяржаву. У сённяшняй Расіі пачэсныя месцы знайшліся для ўсіх путчыстаў дзевяноста першага года. Адзін з іх нават абраны дэпутатам Дзяржаўнай Думы. Не ведаю, хто з майго пакалення дажыве да дэмакратычных пераменаў. Ды нешта ўнутрана падказвае мне, што суркоўска-пуцінская хунта і яе філіял у Беларусі, не працягнуць доўга. А рассыпаюцца такія сістэмы адразу, умомант і ўшчэнт. Таму, што трымаюцца толькі на страху, хлусні і подласці. Таму, што пры першай небяспецы „добрыя хлопцы” разбягуцца хто куды.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Памяць і гонар

13 жніўня г.г. у Закапаным прэзідэнт Рэчы Паспалітай Лех Качынскі адкрыў помнік Юзафу Курасю, псеўданім „Огень”, змагару супраць устаноўленай у Польшчы пасля другой сусветнай вайны ўладзе; дзеля гэтага акту ён нават перапыніў свой водпуск. Прэзідэнт зазначыў, што гэты акт з’яўляецца вяртаннем памяці і шкадаваў, што Польшча не надта помніць пра герояў збройнага антыкамуністычнага падполля. Улады Закапанага згадзіліся паставіць у сябе такі помнік, нягледзячы на пратэсты часткі навакольнага насельніцтва і некаторых акаўцаў, якія абвінавачвалі героя ў самавольстве, забойствах і рабаўніцтве. Тэлебачанне паказала патрэбнага вучонага, які тлумачыў, што людзі абураюцца на ягонага героя няправільна, ідучы на павадку ранейшай камуністычнай прапаганды; пра ўласную памяць тых людзей аб негеройскіх подзвігах героя, пра іх годнасць, вучоны ўжо не згадаў. З-за згаданых пратэстаў не ўдалося паставіць такога ж помніка ў родным горадзе Курася — Новым Таргу. Ды і ў самым Закапаным установлена асвятленне і маніторынг помніка дзеля аховы яго перад гневам тых, каго абурае такое ўшанаванне памяці.

У гэтым месцы варта прыгадаць, што 31 ліпеня г.г. варшаўскі Акруговы суд адмовіў кампенсацыі адной з сямейніц ахвяр іншага змагара супраць пасляваеннай улады ў Польшчы, трагічна праслаўленага ў нас „Бурага”; пра судовы разбор было ў „Ніве” ад 13 жніўня г.г. І ў гэтым выпадку ў краёвых вярхах і нізах ёсць асобы, гатовыя палічыць „Бурага” нацыянальным героем і ставіць яму помнікі. Варта прыгадаць у гэтым месцы Анджэя Пшэвозьніка, лідэра Рады аховы памяці змагання і мартыралогіі, які ў свой час не знаходзіў падстаў для ўстанаўлення ахвярам „Бурага” помніка ў Бельску-Падляшскім. У Закапаным Пшэвозьнік падкрэсліў, што тамашняму герою вяртаецца памяць і гонар...

У польскім публічным жыцці вельмі падкрэсліваецца прыналежнасць краіны да заходняй цывілізацыі. З фармальнага пункту гледжання гэта не выклікае засцярог: за гэтым прамаўляе не толькі алфавіт, але і вельмі сучаснае сяброўства Польшчы ў НАТО і Еўрасаюзе, у дэмакратычным свеце. Але калі загляднуць за гэты фасад, у менталітэт польскіх эліт, дык там відаць даволі цікавую карціну. Для прыкладу вазьму жнівеньскае Варшаўскае паўстанне 1944 года. У яго выніку згінуў цвет польскай моладзі, была амаль поўнасцю зруйнавана сталіца. Палітычнае кіраўніцтва АК лёгкай рукою, як сам найслаўнейшы сталінскі маршал Жукаў, кінула на смерць дзесяткі тысяч людзей, своеасаблівым спосабам падмацоўваючы пятую гадавіну нямецка-савецкага дагавора, які ліквідаваў польскую дзяржаўнасць. Я сумняваюся, што ў дэмакратычным свеце за такое марнатраўства не прыцягнулі б яго ініцыятараў да адказнасці, нават толькі гістарычнай. Але ў нас пра гэты ценевы бок маўчок, гаворка ідзе толькі пра гераізм, а дутыя флагманы ветэранаў, так як і ў Масковіі, вырашаюць пра ацэну мінулых і актуальных падзей. І не толькі вакол Крамля, але і ў нас, можна пачуць ганарыстасць ад нейкіх сваіх метавартасцей, якіх быццам няма на „прагнілым” Захадзе.

У польскім публічным жыцці з вялікім размахам вядуцца люстрацыйныя баі. На прыцэл бяруцца суддзі, журналісты... Час ад часу люстрацыйны снарад зваліць з ног нейкага палітыка. Люстрацыйная катавасія падступае пад магутны Касцёл. Але ніхто не згадвае, каб скіраваць святло люстрацыі на герояў. Каб прыглянуцца ім не ў актуальным юрыдычным аспекце супрацоўніцтва з ранейшымі спецслужбамі, але глянуць на іх учынкі папросту. Каб прысвяціць крыху ўвагі тым, што па асабістым вопыце інакш ацэньваюць герояў або маўчаць пра іх „подзвігі”, запалоханыя іх тэрорам. Ды як не баяцца, калі сам прэзідэнт дзяржавы патрабуе, каб героям было яшчэ больш... Дарэчы, героі патрэбныя не толькі ў Польшчы.

Героі патрэбныя таталітарнай дзяржаве. Пра гэта можна пераканацца гартаючы старонкі „Беларускай савецкай энцыклапедыі”, дзе амаль усё зведзена да гераізму. „Курица не птица, Польша не заграница” — гаворыцца за ўсходняй мяжой. І ў нашага прэзідэнта, так як і ў яго ўсходніх калегаў, размашыстая славянская душа, радая вышэйшым метавартасцям. Не трэба забываць і ў якім антуражы праходзіла яго дзяцінства, бо czym skorupka za młodu nasiąknie, tym na starość trąci. І што для ўстанаўлення стандартаў і звычак прававога грамадства патрэбныя не гады, але дзесяцігоддзі.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Вачыма еўрапейца

Журналісты-абранцы

У свой час у Польшчы выбухла афёра вакол аднаго маладога чалавека, які быў асістэнтам дэпутата Польскай народнай партыі (ПСЛ), што ачольваў адну з сеймавых следчых камісій. Гэты малады чалавек ахвотна карыстаўся запрашэннямі на банкеты ў расійскім пасольстве. Пасля тлумачыўся, што бываў там, бо займаецца ўсходняй палітыкай. Сустракаўся ён у рэстаранах на вячэрах з адным з вышэйшых прадстаўнікоў гэтага пасольства. Дазваляў нават сабе пазычаць ад яго грошы. Канчаткова аказалася, што працаўнік пасольства — расійскі шпіён. Маладым асістэнтам занялася пракуратура, якая высвятляла наколькі свядома, а наколькі і не ды якія інфармацыі мог ён пераказваць. Асістэнт рабіў ўражанне дзіцяці ў тумане — у поўнай несвядомасці, што могуць яго выкарыстоўваць спецслужбы, не заўсёды прыхільныя і разыгрываючыя ўласныя інтарэсы, няраз далёкія ці супярэчлівыя гэтым, якія прадстаўляе ягоная краіна: член Паўночнаатлантычнага дагавору і Еўрасаюза.

Прыгадалася мне гэтая падзея амаль два месяцы таму, калі глядзеў я здымкі з прыёму ў Генконсульстве Рэспублікі Беларусь у Беластоку з нагоды афіцыйнага Дня незалежнасці. Быццам ас контрразведкі ўзіраўся я хто з афіцыйных асоб паявіўся ў прадстаўніцтве ўрада, які распраўляецца з апазіцыяй, зачыняе незалежныя газеты, урэшце, маніпулюе — далікатна сказаўшы — польскай меншасцю. Звочыў я свецкіх прадстаўнікоў праваслаўных арганізацый, мясцовай Царквы, беларуска-праваслаўных самаўраднікаў з Беластока і глыбінкі, БГКТ. З „верхняй паліцы” — па-за прадстаўнікамі Царквы — я нікога не заўважыў. Падобна было на прыёме ў Варшаве — да таго не на тэрыторыі пасольства, а ў былой рэзідэнцыі польскіх каралёў — Вілянове (!). Ніхто з „важных” не дазволіў сабе на ўдзел і падараванне сабе, як было напісана ў афіцыйным камюніке пасольства, беларускіх сувеніраў. Два дні пасля банкетаў у консульстве і пасольстве прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка ганарыўся, адсвяткоўваючы Дзень незалежнасці ў Мінску: „Белорусский народ успешно строит свое будучее. Объективные результаты нашей деятельности подтверждают: мы на верном пути. У нас есть ясная, выверенная жизнью и поддержанная всем белорусским народом стратегия дальнейшего развития страны”. Тыя, што прымаюць запрашэнне на банкеты ў консульстве і ў пасольстве, сваёй прысутнасцю здаюцца пацвярджаць, што адабраюць такую ўяву суседкі Польшчы, дзяржавы ў сярэднеўсходняй Еўропе.

Калі выходзіць з друкарні гэты нумар „Нівы”, Генконсульства РБ у Беластоку сарганізавала мясцовым журналістам экскурсію. Мелі яны пабачыць (у перспектыве, у якой ім дазволіцца ўбачыць?) Аўгустаўскі канал, Гродна, Навагрудак. У своеасаблівым, лукашэнкаўскім стылі, былі выбраны адзінаслушныя СМІ. Не „Ніва”, „Czasopis”ці Радыё Рацыя. Наколькі я ведаю, калі пішу гэты тэкст, ад гэтага двухдзённага паходу адмовілася Радыё Беласток. Яго шэф Міраслаў Бяляўскі сказаў мне:

— У сувязі з такім адборачным запрашэннем мы рашылі не камандзіраваць нашага журналіста.

Падобна адрэагавала „Газета Вспулчэсна”. Галоўны рэдактар гэтай газеты Конрад Крушэўскі заявіў:

— Не можам карыстацца прапановай прадстаўніцтва ўрада Беларусі, асабліва ў такой сітуацыі, калі праследуецца ў гэтай краіне польская нацыянальная меншасць.

Які і ў звычайным, г.зв. нармальным штодзённым жыцці, варта памятаць, з кім сустракацца і якімі запрашэннямі карыстацца, нават калі вабяць багата і смачна застаўленыя сталы, падарункі ці краса краявідаў. Датычыць гэта асабліва палітыкаў рознага ўзроўню разам з іх прадстаўнікамі, ды і чацвёртай улады — журналістаў.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мая Трансмалдавія

— Толькі абмінай Прыднястроўе, — асцерагаў знаёмы, — там могуць застрэліць і закапаць у кукурузе.

І я сама, калі шукала па Інтэрнэце інфармацыю пра Малдавію, трапляла на нюсы тыпу: Дзяржава трымаецца на гандлі чалавечымі органамі. Турысты абмінаюць яе шырокім колам.

Вельмі падабалася апошняя вестка.

Бо я наіўная *рудая мыш* думала ўсё пра малдаўскае віно, якое ў Кішынёве смакуюць на вуліцы, проста з бочкі. Пра цудоўныя хоры, якія прыязджаюць да нас на Фестываль царкоўнай музыкі.

Пры нагодзе высветлілася і іншая праўда — цяжка туды патрапіць. З усіх бакоў краіну акаляе якісьці нябачны мур. Нейкія пасткі. Раптам у дарозе ўзрываецца ад паводкі мост на рацэ, або сустракае нікім не прызнаная ў свеце дзяржава з танкамі на вуліцы. Такое здарылася з намі.

У сталічны Кішынёў дабіраліся мы кругаля, цераз Адэсу. Чатыры дні і тры ночы. Без крупінкі інфармацыі і ўпэўненасці, каб там вандраваць сляпіцай, ад месца да месца, спасылаючыся на словы выпадковых людзей. Каб пасля вяртання мазгаваць дзень і ноч: куды мы папалі?

* * *

У гэты раз мела быць „цацы". Ідзе пра сямейныя спрэчкі. Мае родныя не дазваляюць мне ездзіць у „дзікія краіны".

— Глядзі, — авантуруюцца заўзята, — яшчэ нарвешся! Не пераканаеш, што ваўка цягне ў лес.

Таму я звярнулася ў бок боскага і падрыхтавала суперпраект, паводле якога мела падарожнічаць па манастырах Малдавіі. Ідэя спадабалася і нават прыдбала шчодрых спонсараў. Сваячка пажадала прывезці ёй ваду са святой малдаўскай крыніцы і сунула ў кішэню сотню.

— Гэта на свечку, — сказала шэптам, каб, барані Бог, не пачуў яе муж.

Найбольш успамог Мішка. Мой сваяк-халасцяк начапіўся каб прывезці яму адтуль... жонку.

— А што будзе, як не спадабаецца?

— Як не спадабаецца? — абурыўся ён. — То ж там усе праваслаўныя!

Міша вылажыў на стол тры сотні і сказаў, што калі іх не прыму, прап'е.

— І глядзі, — ён пагразіў яшчэ мне пальцам, — каб яна была з нармальнымі, а не залатымі, зубамі!

Я спачатку баранілася. Уяўляла, як зліваюся з прапагандысцкім вобразам „дзікага краю" і ўжо ў сябе гандлюю „жывым таварам". Але сваяк пераканаў мяне ў шляхетнасці місіі.

— Калі не спадабаецца мне, — дражніўся, выскаліўшы зубы, — то возьме яе хто іншы!

Тут якраз не было сумненняў.

Можа адразу скажу як усё гэта скончылася. Калі замест жонкі я прывезла малдаўскі каньяк, Мішка завыў ад шчасця. У той час нехта ўсвядоміў яго, што малдаванкі размаўляюць па-румынску.

— А мне ўсё старыя цыганкі сніліся, — прызнаўся.

Я сядзела ашарашаная прызнаннем і гадала: чаму мой добры сваяк прамаўляе мовай дурной прапаганды?!

* * *

Калі быў ужо праект, мэта ды грошы, я стала шукаць адважнай кампаніі. Спачатку загарэлася пяць ахвотных, дзень да ад'езду асталася адна сваячка Т. Мы загрузілі рукзакі і рушылі на канец горада. Што можна сказаць пра польскі аўтастоп? Цывілізацыя і культура! Цераз восем гадзін язды самаспынам мы шчасліва апынуліся ў Холме.

Праўда, тут „впендрыўся" нейкі тормаз, мы застраглі на перыферыі Холма і чыпелі як тыя сіроткі. На дварэ зрабілася цёмна, халаднавата. Я змагалася з першай паразай. За паўтары гадзіны меў адправіцца аўтобус з Ковеля ў Камянец-Падольскі. Паводле найлепшага ў свеце плана (вядома, майго) мы мелі расесціся ў фатэлях аўтобуса і храпці да самой раніцы. Дарога і заадно начлег мелі каштаваць адзінаццаць долараў. Далей, паводле майго суперплана, мы павінны перасячы мяжу і яшчэ ў той самы дзень паставіць нагу ў сонечнай Малдавіі.

Калі паглядзець на карту — усё выглядае „цацы". З Холма ў Ковель адно шэсцьдзесят кіламетраў. Аднак па дарозе ёсць яшчэ мяжа, канкрэтна, рака Буг. Каб апынуцца ва Украіне, трэба выстаяць там тры-чатыры гадзіны. Словам — не было ніякага шанцу.

Першую ноч мы правялі ў сціплай гасцёўні на перыферыі Холма.

— Ach na Zieloną Ukrainę? Pewnie na Krym? — зашчабятала ў акенцы пафарбаваная бландзінка.

— Не-не! — мы заракаліся, што абмінем усякія Адэсы і Севастопалі.

Але Крым не перанёс такой знявагі.

У нашым пакойчыку прывіталі нас фоташпалеры з чарнаморскай панарамай.

— О, кузьва! — выляцела з вуснаў няздзейсненай паломніцы.

* * *

Навошта — мучыла думка — ехаць аж у Адэсу? Здымкі на фоне Чорнага мора можна зрабіць ужо ў Холме. Калі таго малавата, трэба пад'ехаць у Львоў і там „дапстрыкацца" на фоне Жалезнага вакзала. Ён кропля ў кроплю — адэскі. Праўда, у Львове няма ўжо культуры, значыць, савецкай пафаснасці, з якой вітаюць шаноўных пасажыраў (вітаюць з музыкай), але яна непрыдатная для фота.

Так ці інакш, раніцай яшчэ перад ад'ездам у чарнаморскі бок, я зачапілася аб штучную пальму і паляцела са сходаў. Страшнавата было падымацца. Я ляжала без дыху ў падножжа гасцёўні і гадала:

— А раптам замест у Крым траплю ў шпіталь?!

На шчасце абышлося без ахвяр і мой суперплан меў усё шанц на рэалізацыю.

У Ковелі абарвалася хмара. У калюжы насупраць аўтавакзала плавала мёртвае кураня. Жанчыны выцягвалі свае чырвона-сінія пластмасавыя сумкі ў клетачку, са скарбамі польскай зямлі: гурбай ружовых сасісак, памідораў, сціральнага парашку, чырвонага і зялёнага перцу, пакетамі напою „Hoop", марожанай і паранай свінінай, курынымі крыльцамі ў фользе...

Мы стаялі ля паруючай калюжы ля аўтавакзала і лічылі гадзіны. Да ад'езду аўтобуса ў Камянец-Падольскі заставалася дзевяць гадзін.

— Прыйдзіце гадзіну да ад'езду, — параіла нам жанчына ў інфармацыйным акенцы. — Прыйдзе начны касір і ўсё скажа.

Фактычна, сорак хвілін да ад'езду з'явіўся начны касір у выглядзе зморанай цёткі.

— Ваш аўтобус зламаўся ў дарозе, — пазяхнула яна і адвярнулася недзе за сябе. Мы стаялі, як цяляты, ля акенца і нічога ўжо не гаварылі. Гэта знервавала кабеціну:

— Я гавару вам, — крыкнула яна, — аўтобус зламаўся. Яго не будзе!

Хацелася паразборнічаць, выкінуць, што мы дабіраемся ўжо 36 гадзін якраз на гэты аўтобус... Але не было часу. У цемры (у горадзе якраз выключылі святло) пачуўся цёплы мужчынскі голас...

— Давайце, дзяўчаты, са мной у Кіеў!

Мы рушылі з месца і пайшлі следам за шафёрам. Няма большага шаманства за цёплы, ласкавы голас сярод цёмнай, дажджлівай ночы...

(працяг будзе)

Ева СЦЕПАНЮК

Колішнія спакусы

З малых гадоў цікавіўся я кніжкамі, шмат іх прачытаў, многія загалоўкі іх забыў, але кніга асталася мне верным другам, ад якога можна многа даведацца і нішто не заменіць яе. І кніжкі я ніколі ў печ не кіну. Мяне асабліва цягнулі, як магніт, такія кніжкі, якія ў нас не выдаваліся або былі забаронены. Помню, што калі я стаў пісьманосцам, дык пазычыў ад аднае жанчыны соннік, выдадзены на рускай мове ў міжваенны час у Варшаве. Цягам некалькіх зімовых вечароў перапісваў я яго ў тоўсты сшытак і лічу яго вельмі верным і дакладным. Пасля перапісаў я ў сшытак выдадзены вельмі даўно „Ключ" на польскай мове; у гэтай кнізе ёсць прароцтвы і прадказана наша будучыня. Пазней перапісаў у сшытак некалькі г.зв. Сівілаў таксама на польскай мове. Адну з іх, большую, нават перапісвалі мне сваім прыгожым почыркам дзяўчаты-тэлефаністкі, што працавалі ў нас на пошце. Гэтыя Сівілы, думаў я, таксама быццам прарочыя і прадказваюць будучыню. А ў сапраўднасці гэта адны дурніцы і абман; такім „прарокам" Сівілаў і „Ключа" дык мог бы быць і я. Помню, у адной Сівіле было напісана, што ў 1956 годзе ўспыхне сусветная вайна; я пасумняваўся ў праўдзівасць гэтага, бо згаданы год ужо мінуў, але ўсё ж меў нейкую надзею, што далейшыя прадказанні будуць больш праўдзівыя. Аднак, як кажуць, забаронены плод найлепш смакуе і я скора пераеўся яго смакам і цяпер нават не ведаю, у якім доме і ў якой скрыні тыя перапісаныя ў сшыткі прароцтвы ляжаць, бо ўжо за трыццаць гадоў не трымаў іх у руках; такі фінал пладоў з забароненага дрэва. Пасля я многа чытаў забароненых у той час палітычных кніг і не ўсе яны цікавыя і праўдзівыя. Праўдзівая і прарочая толькі Біблія. Ёсць яшчэ адна кніжка, Брусаў каляндар, яго варта мець, бо ў ім прагнозы надвор'я і чалавечы лёс на кожны год праўдзівыя і збываюцца. Напісаў яе пісьменнік Брус Якаў Вілімавіч, расійскі дзяржаўны і ваенны дзеяч, паплечнік цара Пятра І. Такі каляндар адзін дзядзька ў нас меў, але нікому яго ў рукі не даваў, нават сваім блізкім.

Мікалай ПАНФІЛЮК

Увага конкурс !!!

Гайнаўскі дом культуры запрашае пластыкаў-аматараў да ўдзелу ў Аглядзе мастацтва непрафесіяналаў Гайнаўскай зямлі. У ім могуць прыняць удзел творцы-аматары, якія скончылі 18 гадоў, а таксама выпускнікі сярэдніх мастацкіх школ. Тэматыка і тэхніка выканання прац адвольная. Кожны ўдзельнік можа даслаць 3-5 прац у адной з такіх галін, як: жывапіс, рысунак, графіка, мастацкая тканіна, разьба, інтарсія.

За дэталёвай інфармацыяй трэба звяртацца ў Гайнаўскі дом культуры, тэл. (085) 682 32 03 і (085) 682 48 08. Працы дасылаць па адрасу: ГДК, вул. Тамары Саланевіч, 4, 17-200 Гайнаўка.

(мох)

„Пэгеэр" прытармозіў развіццё вёскі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

У пасляваенны перыяд мнагалюдныя сем'і жылі ў дамах, якія ў Парцаве часта будаваліся франтонамі да вуліцы

Перад вайной жылі ў Парцаве багатыя і бедныя людзі ды стараліся ладзіцца паміж сабой у выпадку недаразуменняў. Жыхары вялікай вёскі, распаложанай побач Бельска-Падляшскага, дапамагалі сабе ў час вайны, калі ад абстрэлаў савецкіх і нямецкіх войск загараліся хаты і клуні. Пасля вайны вяскоўцы не схацелі ўступаць у калгас, бо ведалі як ішлі справы ў калектыўнай гаспадарцы ў суседніх Галадах, дзе калгас арганізавалі яшчэ пры савецкай уладзе. Жыццё ў сяле ўскладнілася пасля вайны, калі народная ўлада абцяжарыла сялян вялікімі падаткамі і абавязковымі пастаўкамі сельскагаспадарчых прадуктаў, а пасля вырашыла арганізаваць у Парцаве „пэгеэр" — саўгас. Мае суразмоўцы з жалем успамінаюць часы, калі на патрэбы „пэгеэра" забралі самыя лепшыя ў вёсцы землі. Багацейшым гаспадарам тлумачылі, што забіраюць зямлю за незаплачаныя падаткі, але ў сапраўднасці было гэта раскулачванне. Тыя гаспадары, што атрымалі ўзамен намнога горшае поле, не былі задаволены новымі надзеламі, на якіх ураджай атрымоўваўся меншы ў параўнанні з плёнамі на бацькаўскіх землях. Маладыя людзі, якім цяжка было гаспадарыць у новых умовах, выязджалі з Парцава на пастаяннае жыхарства ў гарады.

Пацярпелі ад ваенных дзеянняў

Жыхары Парцава і яго забудова пацярпелі ад абстрэлу вёскі савецкімі і нямецкімі салдатамі. Баі за вёску і наваколле ў час савецкага наступлення летам 1944 года зацягнуліся. Ваенныя падзеі гэтага перыяду памятаюць старэйшыя жыхары вёскі, тады маладыя хлопцы і дзяўчаты.

— Калі савецкая армія гнала нямецкія войскі, баі ў нас доўжыліся цэлы тыдзень. Тры дні немцы бараніліся ў нашай вёсцы. Рускія салдаты пачаткова абстрэльвалі сяло з напрамку Вулькі, а пасля наступалі. У час абстрэлу забілі яны адну нашу жанчыну і ранілі дзве асобы. Загарэліся тады дзве клуні, — пачынае расказ Уладзімір Шэшка. — Вёска была тады набітая нямецкімі вайсковымі. Мяне зацікавілі іх матацыклы, якіх я раней не бачыў. Пярэдняе кола было ў іх цэлае гумовым, а ззаду — гусеніца. Калі немцы адступілі з вёскі, не адышлі далёка. Акапаліся яны некалькі кіламетраў за сялом, непадалёк Бельска. У савецкай арміі было менш тэхнікі, многія салдаты прыехалі конна.

Распалажэнне Парцава непадалёк ад Бельска-Падляшскага, які быў адміністрацыйным і гаспадарчым цэнтрам, мела адмоўнае ўздзеянне ў час вайны на лёс сяла. Баі за горад прытармозілі фронт і жыхарам вёскі прыйшлося другі раз перажыць абстрэл, на гэты раз з боку нямецкіх войск.

— Савецкі разведчык добра вызначыў месца нямецкіх акопаў і з-пад Вулькі рускія салдаты пачалі абстрэльваць немцаў. Пазней нямецкія войскі пад'ехалі пад нашу вёску і пачалі абстрэльваць савецкія пазіцыі ў Парцаве. Нямецкі разведчык сядзеў з бінокламі на ўзгорку і дакладна даваў каардынаты для абстрэлу. Загарэліся тады чатыры хаты і ранены быў вясковец. Адзін нямецкі снарад трапіў таксама ў нашу хату. Загарэўся тады прысценак ад вуліцы, але суседзі здолелі патушыць агонь. У даху засталася толькі дзірка ад снарада. У час абстрэлу немцы забілі таксама некалькі саветаў, — кажа спадар Шэшка.

У пасляваенны перыяд

Гаспадарам, у якіх гарэлі хаты або клуні, цяжка было адбудоўвацца пасля вайны. Тады прыходзілася плаціць высокія падаткі і аддаваць за сімвалічную плату сельскагаспадарчыя прадукты на патрэбы дзяржавы.

— Мала было ахвотных уступаць у калгас і таму не быў ён у нас заснаваны. Багацейшыя гаспадары прывозілі на працу ў полі людзей з іншых вёсак, бо бяднейшыя сем'і найчасцей працавалі на сваіх палях. У нас было чатыры гектары зямлі, але неяк мы гадаваліся на ёй, — гаворыць Уладзімір Шэшка.

Пасля вайны па панадворках Парцава хадзілі секвестратары і забіралі быдла за незаплачаныя падаткі.

— Нам таксама забралі быдла і авечкі, а аставілі толькі коней, — кажа Марыя Себясевіч. — Бывала, купіш цяля, станеш гадаваць, а прыйдзе секвестратар і забярэ яго.

— Мы амаль без хлеба асталіся. Сказалі нам аддаваць збожжа пад пагрозай турэмнага зняволення, — заяўляе Ян Себясевіч, якому зараз за дзевяноста гадоў і, хіба, найстарэйшы жыхар Парцава.

Умовы гаспадарання палепшыліся пасля ліквідацыі цераспалосіцы, якая адбылася прыблізна дваццаць гадоў пасля вайны.

— Раней часта здаралася, што палоскі поля ўшырыню не перавышалі трох метраў, а ўдаўжыню поле цягнулася нават па два кіламетры, — гаворыць спадар Уладзімір Шэшка. — Пасля камасацыі сталі мы купляць конныя касілкі, якімі карысталіся таксама ў час жніва.

Прымусілі аддаць зямлю ў „пэгеэр"

Калі сталі арганізаваць у Парцаве саўгас (пэгеэр), у вёсцы было каля 130 хатаў, а сем'і найчасцей былі многалюднымі.

— Калі я прыйшла замуж у Парцава, было гэта вельмі багатае сяло. Былі тут добрыя землі і расло прыгожае збожжа. Людзі гадавалі многа коней, быдла і авечак. Пасля найлепшыя нашы землі, на якіх расла пшаніца, забралі пад „пэгеэр", які быў арганізаваны ў канцы шасцідзесятых гадоў, — кажа Марыя Себясевіч.

— Арганізуючы „пэгеэр", прытармозілі развіццё нашай вёскі. Маладыя сталі ўцякаць у гарады і спынілася разбудова сяла, — заяўляе старэйшая жанчына.

У сям'і Себясевічаў таксама забралі многа поля ў "пэгеэр".

— Муж ляжаў тады ў бальніцы, а я гадавала малых дзетак і не магла абараніцца. За чатыры гектары поля не далі нам кампенсацыі, а за іншае поле далі зямлю слабейшай якасці, на якой сеялі мы жыта. Тлумачылі нам, што забіраюць поле за незаплачаныя падаткі, але забіралі зямлю і ад тых гаспадароў, што падаткі плацілі. Сын наш любіў працаваць на гаспадарцы, але пайшоў на работу ў горад, бо на той зямлі, што нам асталася, цяжка было гаспадарыць. Пасля бралі мы яшчэ зямлю ў арэнду, бо трэба было неяк жыць, — успамінае спадарыня Себясевіч.

Хіба найбольш пацярпелі ад „пэгеэра" ў Парцаве гаспадары, у якіх было многа зямлі.

— У сям'і Дзенісюкоў было каля сарака гектараў зямлі і ўсю яе забралі. Забралі таксама поле ў іншага гаспадара. Сям'і Дзенісюкоў далі некалькі гектараў поля ўзамен, але яны не хацелі яго абрабляць, — кажа Марыя Себясевіч.

У дзевяностыя гады „пэгеэр" абанкруціўся, прадалі жывёлу, а зямлю пераняў прыватны ўласнік.

— Палякі жылі і жывуць у „пэгеэры". Некаторыя саўгасныя кватэры купілі жыхары суседніх вёсак, — гаворыць Марыя Себясевіч. — Мы крыўдавалі, што не вярнулі нам нашай зямлі.

Аляксей МАРОЗ

Гасцявалі на „Купалінцы”

29 ліпеня г.г. у агратурыстычнай гаспадарцы „Купала” Ірыны і Зіновія Галёнкаў, што ў Арэшкаве-Парыеве, адбылося штогадовае рэгіянальнае мерапрыемства „Купалінка”.

Паспрыяла надвор’е і з’явілася за дзве сотні гасцей: суседзяў, знаёмых і заўсёднікаў мерапрыемства; многія з’явіліся разам з сем’ямі. Шматлюдная прысутнасць даказвае, што „Купала” з’яўляецца выдатным месцам для адпачынку. А яшчэ дзесяць гадоў таму гэтае самае месца — без інфраструктуры — было быццам бескарыснае. Зараз госці маглі наведаць міні-заапарк, у якім хатняя жывёла і птаства жывуць у неспатыканым сімбіёзе, а іншая дзікая звярына (свінадзікі, тарпаны ці страусы) у агароджах і не палохаецца людзей. Можна тут пабачыць помнікі мясцовай даўніны, азірнуць наваколле з назіральнай вышкі, павудзіць, паспаборнічаць і выйграць узнагароду, добра з’есці, выпіць і патанцаваць пад добрую і разнастайную беларускую музыку. Такая сямейная атмасфера царыла і сёлета.

Да поўдня адбылося спаборніцтва вудзільшчыкаў, у якім заўсёды прымае ўдзел каля дваццаці чалавек, у іх ліку жанчыны і сеніёры. Найстарэйшым вудзільшчыкам з’яўляецца гаспадароў бацька, 84-гадовы Зіновій Галёнка, які раней спаборнічаў нават у кіданні абцугоў. І ў гэтым годзе, нягледзячы на клопаты са здароўем, бо толькі што выйшаў са шпіталя, ён зноў перамог у сваёй катэгорыі вудзільшчыкаў. Пераможцы гэтага спаборніцтва атрымалі кубкі ў выглядзе рыб, іншыя ўдзельнікі атрымалі дыпломы і кожны мог забраць з сабою злоўленую рыбу.

Пасля поўдня на конскай пашы адбыліся спаборніцтвы па кіданню кавальскіх абцугоў. У змаганнях, у трох разрадах, прынялі ўдзел каля пяцідзесяці чалавек. На гэты раз для кідання былі падабраны найцяжэйшыя абцугі, каб мінімалізаваць адлегласць (у мінулым годзе пераможца паслаў абцугі пад пяцьдзесят метраў). Змаганні адбыліся хутка і спраўна, без удзелу ранейшых чэмпіёнаў — каб даць шанц іншым.

У катэгорыі жанчын перамагла Галіна Нікалаюк, якая кінула абцугі на 20,76 метра, другое месца заняла Ірына Палецкая (18 м), а трэцяе Эвеліна Кубай — 17,86 м. Сярод мужчын перамог Адрыян Амбражэвіч, які паслаў абцугі на адлегласць 31,32 метра, другім быў Міраслаў Мусько, які ўступіў пераможцы толькі на два сантыметры, ды і трэці, Адам Тышко, таксама мала ім уступіў, махнуўшы 31,24 м. У маладзёжнай катэгорыі перамаглі Марта Вэльфэк — 15,15 м і Барташ Міхалоўскі — 18,80 м.

Пераможцы атрымалі жывых жывёл, з просьбай гадаваць іх далей. І калі ў мінулым годзе такія ўзнагароды атрымала больш пераможцаў, то сёлета толькі двое: жанчына — белага казліка „Матолка”, а мужчына — чорнага барана. Да таго гаспадар ахвотным дзецым падарыў для далейшай гадоўлі трох трусікаў. Прызёры спаборніцтва атрымалі кубкі, а апошнія ўдзельнікі — дыпломы.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Новы галубятнік, выкананы аўтарам артыкула

Пасля ўручэння ўзнагарод пачалася танцавальная забава на траве, якую назвалі патупайкай; іграў маладзёжны калектыў „Ваякі” з Чаромхі. Буфет прапанаваў апетытныя стравы, да таго ж нейкая вонкавая фірма паклапацілася і пра вясёленькія напоі. Музыкі спачатку дастасоўвалі свае творы да старэйшай публікі, а пасля стала яна набываць размаху. Танцавала каля сотні асоб, аж стагнала зямля. З дзесятай гадзіны вечара забава змянілася ў дыскатэку.

Госці гулялі спакойна, не заўважалася занадта падвыпіўшых, танцоры не пакідалі таксама смецця. Пакідаючы забаву многія госці, асабліва старэйшыя, дзякавалі гаспадару мерапрыемства за міла праведзены час. Толькі раніцай высветлілася, што незадаволеным забавай быў афрыканскі страус, які ноччу так расхадзіўся, што папсаваў крыху агароджу; ці гэта музыка была занадта галосная, ці не спадабаліся яму розныя ад афрыканскіх рытмы, а мо і ён так хацеў дарвацца да танцаў...

Мерапрыемства ладзіла фірма „ZEGIR”, вытворца гумавых і сіліконавых вырабаў, якой уласнікамі з’яўляюцца гаспадары „Купалы” — сужонства Ірына і Зіновій Галёнкі. Пра мерапрыемства Зіновій Галёнка сказаў:

— „Купалінка” шмат каштуе, але яна з’яўляецца прамоцыяй і „Купалы”, і фірмы „ZEGIR”. Вось у сёлетнім сезоне „Купалу” наведала больш гасцей, чым годам раней; былі гэта турысты з-за Гайнаўкі. На папулярнасць нашай гаспадаркі ўплывае і тое, што мы пашыраем дыяпазон цікавінак. Сюды мы купілі шмат новых сталоў і лавак, выразаных з тоўстых бярвенняў таполяў; іх паставіў нам тартак у Шчытах. У гэтым годзе прыбыў і прыгожы васьмібаковы галубятнік; выканаў яго ніжэйпадпісаны.

Некалькі гадоў таму паказвалі мы падкоўванне каня, а сёлета справілі мы тут новую кузню. Яна будзе ўжытковым музеем, дзе можна будзе пабачыць кавальскую працу. Яшчэ хачу пабудаваць і падобную сталярню. Да зімы трэба будзе накрыць пансіянат, які ўжо ў сырым стане. І калі будзе начлежная база, тады будзе і месца для культуры і наша гаспадарка стане дыхаць двума лёгкімі, — з аптымізмам сузірае будучыню спадар Галёнка.

Міхал МІНЦЭВІЧ

Божа, ахоўвай нас ад неўдалотаў

Спякотнае лета надакучыла ўсім: і людзям, і жывёле. Душна было нават на пляжах Семяноўскага вадасховішча — у Рудні ці Старым Дварах. Станоўчым ва ўсім гэтым было тое, што можна было ўдоваль наглядзецца на прыгожых жанчын у рознакаляровых купальніках.

Духата адмоўна паўплывала таксама на некаторых нашых самаўрадавых дзеячаў і чыноўнікаў. І хаця неўзабаве гарачае лета заменіць халодная восень, будзе ім душна аж да самаўрадавых выбараў. Будуць яны прачынацца ноччу, быццам заяц пад мяжой, ад няўпэўненасці ці ўдасца ім атрымаць ад выбаршчыкаў пропуск у самаўрадавыя структуры на чарговыя чатыры гады. Не будзе ў іх спакойнага сну ад жахлівай перспектывы страты пасады, калі выбаршчыкі не паставяць крыжык пры іх прозвішчах на бюлетэнях для галасавання і скажуць „стоп” з прычыны абыякавага стаўлення да беларускай меншасці, яе мовы і культуры.

Некаторыя цяперашнія гмінныя і павятовыя нашыя радныя ні разу не вынеслі на разгляд справу дарожных указальнікаў на беларускай мове. Нам, выбаршчыкам, трэба памятаць, што „засядзеўшыеся” радныя, войты і іншыя чыноўнікі перад выбарамі будуць нам зноў туманіць галовы, прыкідвацца патрыётамі, абаронцамі беларускасці. Гаварылі яны ўсё гэта ўжо ў час папярэдняй кампаніі і слова не стрымалі. Цяпер трэба ім смела сказаць: вы нас падвялі, бо не падтрымоўваеце нашу тоеснасць, не дапамагаеце захаваць нашу спадчыну.

Вось вам адзін прыклад. Польскія газеты паведамілі, што войт Чаромхаўскай гміны асігнаваў на беларускія мерапрыемствы, у тым ліку на фэст... тысячу злотых. Адкуль узяць рэшту, бо за такія грошы культурная імпрэза не атрымаецца. Мне хацелася б, каб войт да беларускіх культурных мерапрыемстваў ставіўся аднолькава як да ўкраінскіх, паколькі ўсе яны фінансуюцца бюджэтнымі сродкамі, значыць, падаткаплацельшчыкамі. Да беларускай культуры войт адвярнуўся спіной. Сорам!

Было б вельмі добра, каб такія прэтэндэнты ў самаўрадавыя органы густа сеяліся і рэдка ўзыходзілі. Гэта пустазелле!

Максім ДРОЗД

60-гадовы юбілей

Сёлета Гмінны кааператыў у Нараўцы адзначае 60-годдзе. ГС у Нараўцы быў заснаваны ў першым пасляваенным, 1946 годзе. Заснавальнікамі кааператыва былі жыхары Нараўкі: Аляксандр Куц, Павел Кабаць, Максім Краснапольскі, Аляксандр Саланевіч, Антон Салавей і Максім Карпюк. Ніхто з іх ужо не жыве.

ГС пачынаў дзейнасць дзякуючы членскім узносам жыхароў гміны, так званым „паям”. Першыя крамы месціліся ў Нараўцы ў пасляжыдоўскіх будынках, а тавары прывозіліся сялянскімі фурманкамі. Па вёсках Нараўчанскай гміны крамы знаходзіліся ў прыватных дамах прадаўцоў. Так было да пачатку 1960-х гадоў. Калі ГС узмоцніўся, тады пабудаваў цэлую сетку мураваных крамаў. У кожнай большай вёсцы з’явілася геэсаўская крама. Яны існуюць і цяпер.

Ва ўмовах рыначнай гаспадаркі ды вялікай кункурэнцыі, ГСам было вельмі цяжка ўтрымацца, але ў Нараўцы не здаліся і далей гандлююць. Шмат людзей працавала і пайшло на пенсію з нараўчанскага кааператыва.

Актуальна ГС у Нараўцы дае працу 37 асобам. У гміне існуе 17 харчова-прамысловых крамаў. У мінулым годзе ГС прадаў рэстаран і цяпер мае грошы на рамонт крамаў, якім ужо больш за сорак гадоў. ГСам у Нараўцы кіруе зараз Марыя Янюк. Варта ўспомніць і былых прэзасаў кааператыва, якіх помняць і шануюць. Гэта Мікалай Зубрыцкі, Валянціна Панфілюк, Антон Салавей, Пётр Карпюк, Аляксандр Кірылюк, Міхал Пясэцкі. Жыхары Нараўчанскай гміны бяруць тавары і ў аўтакрамах, і ў сваіх „геэсаўскіх”. Вельмі добра, калі ў вёсцы ёсць крама, ветлівая прадаўшчыца, якая параіць што лепш купіць. Асабліва восенню і зімою сяляне ахвотна ідуць у краму, дзе цёпла, чыста і ўтульна. Нехта з маладых знойдзе ў краме сваю першую працу і звяжа свой лёс з ГСам. Не так даўно ў краме ў Альхоўцы атрымала працу маладая прадаўшчыца Эмілія Граматовіч. Яна вельмі задаволеная сваёй першай працай, належным чынам дбае і стараецца як можа. Аднавяскоўцы яе таксама хваляць. З нагоды пачэснага юбілею хочацца пажадаць нараўчанскаму ГСу яшчэ многіх гадоў існавання.

Мікалай ВАРАНЕЦКІ

Мёд „Белавежскі ліпень”

Гайнаўскія пчаляры пастанавілі мець свой рэгіянальны прадукт — мёд „Белавежскі ліпень”. Апрацавалі статут і выбралі фірменны знак. І вось сёлета ў жніўні на Мёдавым фэсце ў Белавежы найбольшым поспехам карыстаўся чысты ліпавы мёд пад назвай „Белавежскі ліпень”. Назву зарэгістравалі ў краёвым рэестры як традыцыйны прадукт. Малы, паўкілаграмавы слоік „Белавежскага ліпеня” можна было купіць за 12 злотых.

Варта прыпомніць адрасы пасек у краіне, у якіх можна купіць пчаліныя маткі: Мар’я Вільдэ, 10-713 Ольштын, вул. Ксенжыцова 8; Мар’я Гембала, 08-110 Седльцы, вул. Акацыёва 57; ІСК Аддзел пчалярства, 24-100 Пулавы, вул. Казімерская 2; Кшыштаф Лоц, Тэадораў 57, 08-114 Скужэц. Калі пчаляр закажа маткі па-за гэтым спісам, рызыкуе, што не атрымае датацыі. **(мох)**

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 39 -

Гражынка першыя крокі пасля вяртання з канікул накіравала... да камп'ютэра. Можна было такога спадзявацца! — Грак спачатку раскрыліўся, каб кінуцца з прывітаннямі да сяброўкі, а калі тая ўключыла тэхніку, дык апалі яму крылы. А колькі хацелася расказаць! Перш за ўсё пра новага жыхара — Мікітку, якога Грак усынавіў а бабуля прыўнучыла...

Мікітка сядзеў у лазовай будцы, якую бабуля набыла на рынку, і нават нос не высоўваў з круглай адтуліны-акенца. Рыхтаваліся з Гракам да прывітання маладое гаспадынькі заранёў. А тая згорбілася над клавіятурай, нос уткнула ў экран — правярала электронную пошту ад сяброў. Мікітка памалу вылез са свайго лазовага іглу, няўпэўненымі крочкамі падышоў на ціхіх лапках да дзяўчынкі, ускочыў на штаніну і палез на калені. Гражынка нічога не адчула. Урэшце ўскочыў на клавіятуру і затупацеў па літарах. Вельмі падабалася яму перабіраць лапкамі якраз па гэтых клавішах, калі нікога не было дома. А тут — чаго ж такі крык: „І што ты напісаў! Што за бязглуздзіца! Ой, гэта не ты, Грак?!"

— Гэта мой сын Мікітка!

Гражынка паставіла кацяня на стол. Мікітка ўзіраўся ў яе круглымі зялёнымі вачыма, пасля ўскочыў на плячо і крануў рудыя кудзеркі кіпцюрастай лапкай.

— Які ён твой сын, калі ты чорны?.. А і ён жа ж не птушка! Вы ж з яйка вылупліваецеся... А наша сям'я ведае, што ў нас у хаце ёсць такое... гракакацяня?

— Бабуля ведае. Мы яго пасялілі, калі вы былі на канікулах. Ну, вядома, у тваім пакоі. Памесцімся, праўда? Мама яшчэ не ведае...

— Мама як мама... Тату на спадабаецца...

— Ён жа такі міленькі... Не зусім шкодны. Толькі фіранку крыху падзёр... і крышачку пакусаў альбом... Дзіцятка ж ён яшчэ, малому трэба дараваць...

— Дазволіш малому, дык і на галаву табе залезе! — вопытна заявіла Гражынка — паўтарыла пачутае ад бабулі.

Адчапіла Мікіту ад сваіх рудых кучаравых валос, якія выразна падраслі за лета і адбліскавалі летнім сонцам.

— Нуй ты... вуркоцік-гракакоцік...

— Гру-гру-гру, — зайграла Мікітку ў горле.

— Чуеш — ён па-мойму ўмее! — пахваліўся Грак.

Міра ЛУКША

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Танцы ў Арэшкаве

На беразе Чорнага мора

Маме на рабоце далі адпачынак, яна прыйшла дадому і сказала Косціку:

— Усё, мы едзем з табою да Чорнага мора.

Косцік страшэнна ўзрадаваўся, бо ён ніколі не бачыў сапраўднага мора, толькі ў кіно ды на малюнках у кніжках.

І вось яны выбраліся ў дарогу. Ехалі цягніком цэлы дзень і цэлую ноч. Удзень Косцік не адыходзіў ад акна, бо і ў цягніку так далёка ён ехаў першы раз. Косцік глядзеў на шырокія лугі, на незнаёмыя станцыі, гарады, на шумныя натоўпы людзей каля вакзалаў.

Калі цягнік прывёз іх на патрэбную станцыю, то аказалася, што яшчэ трэба ехаць аўтобусам.

І вось яно, мора. Па-першае, Косцік вельмі здзівіўся. Мора было не чорнае, як яно называлася, а сіняе і часам нават блакітнае. Марскія хвалі то залівалі бераг, усыпаны круглымі каменьчыкамі, то адступалі, то зноў набягалі на бераг. Мора было вялікае-вялікае, аж да гарызонту, і па ім плыў белы карабель.

Уздоўж мора ішла дарога, а з другога яе боку ўзвышаліся горы, на якіх раслі дрэвы і кусты, чамусьці сухаватыя і калючыя. Ды і тут, унізе раслі дрэвы, якія Косцік раней таксама бачыў толькі на малюнках у кніжках.

— Пальма, пальма глядзі, мама, гэта пальма, — паказаў Косцік на дрэва з камлём, быццам абвязаным кудзеляю.

— Так, гэта пальма, — адказала мама. — Яна называецца веернаю, бо, бачыш, яе лісты на веер падобныя.

— А гэта як называецца? — спытаў Косцік, паказваючы на высачэзнае, падобнае на слуп, дрэва з круглымі маленькімі шышачкамі.

Гэта кіпарыс. Ён падобны на нашу елку, толькі яго галінкі не калюцца. А вунь тое дрэва, з бліскучымі лісточкамі — лаўровае. Панюхай, як яно пахне...

Косцік падбег да дрэва і пачаў нюхаць лісточкі.

— Яно супам пахне! — крыкнуў ён.

Мама засмяялася.

— Не дрэва супам пахне, а суп лаўровым лістам, — сказала яна. — Лісточкі з гэтага дрэва ў суп кладуць.

Косціку вельмі спадабалася мора, ён з яго не вылазіў бы, падабалася змагацца з тугімі хвалямі, якія часам, калі разгуляюцца, выкідвалі Косціка на бераг, як трэску. Але мама не дазваляла купацца ў бурным моры, казала, што гэта небяспечна, што хваля можа захліснуць, і тады не выплывеш.

Тут, каля мора, Косцік пазнаёміўся з Валодзем, які таксама прыехаў сюды з мамаю. Часта яны разам купаліся, разам хадзілі ў горы. Вельмі цікава было глядзець з высокай гары на мора. Яно выглядала тады яшчэ большым, хвалі блішчэлі на сонцы, а вада часам здавалася зялёнаю.

Аднойчы яны загуляліся ў гарах і вярталіся дадому ўжо вечарам.

— Акунуцца б цяпер у моры, стому як рукой здыме, — сказаў Валодзя і тут жа пабег да вады. Косцік стаяў на беразе і глядзеў, як Валодзя, разграбаючы ваду рукамі, уваходзіў у мора глыбей і глыбей. І раптам Косцік убачыў, што вада вакол Валодзі быццам загарэлася. Яна свяцілася, блішчэла і пералівалася, нібы пафарбаваная срэбранай фарбай.

— Ой, Валодзя, — крыкнуў Косцік. — Ты паглядзі, якое мора!

Але Валодзя не здзівіўся. Ён не першы раз прыязджаў да мора і ведаў ужо шмат якія яго таямніцы. Ён засмяяўся, пачаў пляскаць па вадзе рукамі і пырскі, нібы жывое срэбра, заіскрыліся вакол яго.

— Калі месяц свеціць і паветра цёплае, дык яно заўсёды такое. Гэта нябачныя вачамі істоткі, ночасветкі ў вадзе свецяцца. Залазь хутчэй і ты, і вакол цябе такая вада будзе! — клікаў яго Валодзя.

Косцік палез у ваду. Ён асцярожна ступаў і дзівіўся, як ад кожнага яго руху вада пералівалася і свяцілася, нібы на дне мора ўключалі вялікую электрычную лямпачку.

А калі хлопчыкі паплылі навыперадкі, то вада блішчэла, іскрылася і быццам радавалася разам з дзецьмі.

Лідзія АРАБЕЙ

Міхась Лядзінскі — татарскі рыцар

Міхась Лядзінскі ў Крушынянах, татарска-беларускай вёсцы на Падляшшы змагаўся з дарослымі лучнікамі. У Крушыняны, якія ажываюць на час татараскіх фэстаў, з'язджаюцца татары і іх сябры з усёй Польшчы. Праводзяцца гульні — і танцуюць, і частуюцца смакоццем татарскай кухні, і змагаюцца ў стральбе з лука ды коннай яздзе. Бо татары — вялікія майстры рыцарскага рамяства. Былі непраўзыдзенымі ваярамі ў Вялікім княстве Літоўскім! Змагаліся нават пад Грунвальдам! І вось Міхаська з Саколкі, вучань першага класа, заняў трэцяе месца! Сакаліны ў яго зрок, меткая рука!

Міхасёвы дзедка Раман ды бабуля Лілля, бацькі таты Мацея, жывуць у Крушынянах. Яны татары.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Міхась Лядзінскі з мамай Аняй

А другія дзед з бабуляй, бацькі мамы Ані, родам з Ліпска і Крынак. Вельмі рады дзед Раман — унук Міхаська прадаўжае род славутага роду ваяроў Лядзінскіх. Важна, каб захаваць і сувязь з зямлёй, за якую змагаліся і аблівалі гаспадарскім потам, у якой пахаваны дзяды-прадзеды. А бабуля навучыла маму Аню, як дагадзіць рыцарам — перш за ўсё добра накарміць: перакачэўнікамі з баранінай або салодкай начынкай, калдунамі, цыбульнячкамі, перамячамі... Гэтыя стравы вядомыя і татарам, і беларусам. Міхасёва цёця, дваюрадная сястра таты Мацея, Таня Андрацкая, навучае ў Пачатковай школе ў Бабіках беларускай мове, а брат Якуб — выдатны майстар беларускага слова, знакаміты дэкламатар-лаўрэат конкурсаў „Роднае слова"!

Міра ЛУКША

Камп'ютэр і Інтэрнэт

(4)

Прынцып работы камп'ютэра, згодна фон Нэйману, заключаецца ў тым, каб з дапамогай **знешняй прылады** (напрыклад, дыскеты ці дыска) у памяць машыны ўводзілася праграма. **Прылада кіравання** „чытае" змест ячэйкі памяці, дзе знаходзіцца першая інструкцыя (каманда) праграмы, і арганізуе яе выкананне. Такім чынам, **кіраўнічая прылада** выконвае інструкцыі праграмы аўтаматычна, без умяшання чалавека. Яна можа абменьвацца інфармацыяй з **памяццю і знешняй прыладай** камп'ютэра.

Знешняя прылада (дыскета ці дыск) звычайна працуе марудней за іншыя часткі камп'ютэра. Таму **кіраўнічая прылада** (клавіятура ці „мышка") можа спыняць выкананне праграмы да завяршэння аперацыі ўводу-выводу са **знешняй прылады**. Напрыклад, гэта здараецца, калі на дыскету памылкова пераводзіцца не тая інфармацыя, што трэба. Усе вынікі выкананай праграмы павінны выводзіцца на экран манітора. Пасля гэтага камп'ютэр чакае наступных сігналаў знешняй прылады.

У 1949 годзе англійскі вучоны Морык Уілксам сканструяваў першы камп'ютэр, у якім увасобіліся ўсе гэтыя прынцыпы фон Нэймана. З таго часу камп'ютэры значна ўдасканальваліся, але ў асноўных рысах яны і дагэтуль адпавядаюць прынцыпам, сфармуляваным Джонам фон Нэйманам.

Першыя камп'ютэры па памерах былі досыць буйнымі — займалі цэлыя залы. Адпаведна, каштавалі яны дорага. Аднак пасля вынаходніцтва мікрасхемаў і мікраплатаў камп'ютэры значна „падрабнелі" ў памерах, іх кошты зменшыліся. Камп'ютэраў стала значна больш.

Напрыканцы 1960-х гадоў надышоў час злучыць камп'ютэры тэлефоннай сувяззю, надышоў час стварыць камп'ютэрную Сетку, надышоў час Інтэрнэту.

Першымі свой унёсак зрабілі амерыканскія вучоныя Льюіс Робертс, супрацоўнік Упраўлення перспектыўных даследаванняў Міністэрства абароны ЗША, і Фрэдэрык Кан, супрацоўнік кампаніі BBN. У 1968 годзе яны наладзілі сувязь праз тэлефонныя правады паміж камп'ютэрамі навукова-даследчых інстытутаў у розных гарадах ЗША.

(працяг будзе)

Ігар КОНЕЎ

С. КНЫШ

Песня падарожніка

З маленства вабіць нас сухі
дарожны пыл,
краін нязнаных таямніцы, дзе
ты не быў.
Нас падарожжа дружыць
з сонцам і вадой,
абшар зямлі абмерай хуткаю
хадой.

Толькі крочаць упарта ногі,
крочаць, крочаць да знямогі.

Раптам знікне дзесьці ціхі
смутак наш,
бо згубіць след у начных агнях.
За даляглядам далягляд
раскінецца наўсцяж,
і зноў пакліча млечны шлях.

Вазьмі заплечнік, компас ды
бадзёрасць духу,
і рушым мы з табою
пазабыўшы скруху.
Паветра водар прагна будзем
піць на золку,
што ёсць на свеце лепей за
вандроўку?

Толькі крочаць упарта ногі,
крочаць, крочаць да знямогі.

„Беларускі рок-н-рол",
Мінск 1994

Польска-беларуская крыжаванка № 36



Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 32: Лівень, дом, ява, муза, коцік, мары, жырафа, зубр, клан, Ала, клічка, яно, кіпцюр, Інка, рэбус, малюнак, калок, кабыла. Матор, мак, вязь, склон, Ева, Лі, ключы, мызачка, карункі, рака, кораб, аптэка, цыфра, укол, мяккі, матрос.

НАШ АРЫЕНТ

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

— 1 —

— Дзе я цябе раней бачыла? — пытаюся ў адарванага на хвілінку ад турыстаў гіда, які займаецца мячэцю ў Крушынянах. Прысеў ён у адных шкарпэтках у сенцах, адпачыць. — Здаецца, на пікеце пад консульствам Беларусі?

— А так, я... анархіст! — прызнаецца Джэміль. — Працаваў на фабрыцы, займаўся экспрэсамі „Філіпса", нават паставілі мяне наглядчыкам, ды цяпер тут, ад рання да вечара, я паказваю мячэць. І расказваю — здаецца, млынок у роце: пра гісторыю татараў у Вялікім княстве Літоўскім, пра іхныя лёсы, пра адметнасць мусульманскай веры. Пра наш Арыент. Калаўрот! Мусіў нехта малады гэтаму прысвяціцца.

— Ну, дык маеш цяпер свой „Арыент-экспрэс"!

Ва ўсіх раней аціхлых, адміраючых Крушынянах паміж аблесенымі пагоркамі, сёння пачынаецца „экспрэс". У вёску ў пошуках экзотыкі або ўласных каранёў мчацца людзі. Перш за ўсё з Польшчы, але трапляюцца госці з усёй Еўропы. Гэта перш за ўсё дзякучы Джанэце Багдановіч, былой турыстычнай гід, якая на дзедаўскім абшырным падворышчы разам з сям'ёй сарганізавала звычайную агратурыстычную гаспадарку, цяпер славутую перадусім адмысловай кухняй. Ды можна гатаваць найлепш у свеце, але калі няма рэкламы, не будзе бізнесу. Трэба трапіць у добры час ды на чалавека з добрым „носам". Выступіла Джанэта на супрасльскіх фэстах, арганізаваных Янкай Чыжэўскай, з гітам: перакачэўнікам — шмат'ярусным рулетам — мясным ці з салодкай начынкай ды іншымі ўсходнімі стравамі. Іхняя крушынянская хата (жывуць пастаянна ў Супраслі) з частункам апынулася ў бедэкерах усяе Еўропы. На уік-энды з'язджаюцца людзі спецыяльна на спецыялы Джанэты, а на мусульманскія святы і фэсты з'язджаюцца тлумы. Так і сёння — на фэст, у арганізацыі якога моцна памаглі фірме „Татарская юрта" Крынкаўскае надлясніцтва і гміна Крынкі, з'ехалася некалькі соцень гасцей — татараў і іх сяброў. Пазмагацца ў стральбе з лука, патанцаваць, паездзіць на конях, навучыцца гатаваць ды пачаставацца экзатычным смакоццем.

— Ці ў Польшчы можна зарабіць на экзотыцы, шматкультурнасці? Якія былі пачаткі моды на татаршчыну? — пытаемся ў Джанэты Багдановіч, чэмпіёнкі свету ў пячэнні кішкі і бульбяной бабкі, страў тутэйшых.

— Калісьці я сюды прыязджала з турыстымі ў якасці гіда. Экскурсіям не хапала ў Крушынянах месцаў, дзе б можна было спыніцца. Я зачыняла мячэць, бо мела ключ, і мы ехалі далей. А іншыя турысты заставаліся. Турысты ехалі ў Багонікі. Крушыняны паміралі. А тут так прыгожа, тут адчуваецца той Усход, Арыент. Я сама нарадзілася ў Тшцянцы пад Познанню, а ў Крушынянах спачываюць мае продкі, Палтажыцкія. Мне схацелася зрабіць тут месца не толькі для турыстаў, але і для татарскай моладзі — нас няшмат, усе параз'язджаліся, хоць сувязь усё моцная і хочацца вярнуцца да каранёў. Калі мы тут пачыналі, дык некаторыя стукаліся ў галовы. Мяне гэта не цікавіла, тым больш, што я гэта хацела зрабіць перш за ўсё для сябе. Не разлічвалі мы на турыстаў з глыбі краіны, на вялікі прыбытак. Я адкрыла зачыненыя дзверы татарскага дому. Раней гэтыя стравы былі ў нас толькі на святы, на Байрамы. Цяпер адкрываюцца нашы смакі. Найбольш гасцей маем дзякуючы „шэптанай" рэкламе. Шмат гасцей з глыбі краіны, з Еўропы, шукае самабытнага Падляшша. Шматкультурнасць выйгравае — не толькі ў стравах, але і ў людзях, індывідуальнасцях, у культуры.

— Ці бралі вы нейкія крэдыты, каб прафінансаваць такое мерапрыемства?

— Не бралі. І пабаяліся браць таксама еўрасаюзныя грошы. Наш калега, які абапёрся на грошы з ЕС, праваліўся, не справіўся з тэрмінамі. Кожны грош, які мы тут зарабляем, інвестуем. Нашы дзяўчаты (тры дачкі — Джаміля, Эльвіра і Таміра — ёсць каму ляпіць калдуны!) вельмі цяжка працуюць, бо гэта нялёгкі кавалак хлеба. І ўсё круціцца. Хочам узяць цяпер крэдыт на абсталяванне, заканчэнне мадэрнізацыі вялікай залы, ды на начлегі, бо людзі хочуць заставацца ў Крушынянах.

— А канкурэнцыя? Маеце ж пад бокам вялікі гатэль у былой школе — „Дварок пад ліпамі"?

— Я ўвесь час адсылаю гасцей якраз туды. Я намовіла дзве жанчыны з вёскі — спадарыню Раісу Макаль і паню, што жыве на Горцы, каб прымалі гасцей у сваіх хатах. Людзі хочуць начаваць у драўлянай сялянскай хаце, не ў гатэлі! І есці тое, што гаспадыня згатуе ім на сняданак, вячэру. А на абеды прыйдуць да нас. Я ад самога рання гатую — каб было на полудзень. Ды не спраўляюся. Добра было б, каб больш гаспадароў прымала турыстаў. Ды тут усе старэйшыя людзі, беларусы, асцярожныя. Ды ёсць ужо такія, што пакуплялі хаты, зямлю. Гэта вёска ўжо адмірала. А цяпер — паглядзіце! У „Дварку пад ліпамі" таксама можна пачаставацца „татарскай" ежай па нашых рэцэптах. Ды яна не такая. Я прапанавала ўласнікам, каб паставілі на беларускую кухню.

— Як вас трактуюць людзі з іншых рэгіёнаў Польшчы? — пыталіся мы раней і ў маладога татара. — Ці не адчуваеце сябе як індзейцы ў рэзервацыі?

— Мы ганарымся сваёй адметнасцю. Не адчуваем нейкага скансэна, рэзервата. Усе, хто да нас прыязджае, ставяцца да нас пазітыўна, яны падрыхтаваныя, ведаюць, да каго едуць. Хочам працягнуць сезон з калегамі — „Турызм — супольная справа"; ёсць такі агульнакраёвы праект. Татарскі шлях, шлях народнага рукадзелля, майстэрні, катанні на санях, вогнішчы, лыжны шлях, конная язда (у нас можна паездзіць на коніках калегі з Пянькоў пад Міхаловам)...

Сярод гасцей — шмат маладых. Сям'я Багдановічаў — бацькі крушынянскага поспеху, прыцягваюць людзей. І поўныя яны энтузіязму.

Міхал-Мухарэм Адамовіч:

— Можна зарабіць на экзотыцы. Толькі трэба ўкласці ў гэта сэрца. Можна знайсці грошы, адно трэба ўмець намовіць інвестараў. Хоць, папраўдзе, лепш пазычыць на пачатак грошы ў сям'і ці знаёмых. Пасля — інвестары, у якіх можна скласці праекты, і банкавыя крэдыты, Еўрасаюз. Мы, маладыя, памагаем Багдановічам; займаем парафіяльную тэрыторыю, значыць, супольную, што мяжуе з іхнім участкам. Ды справа не ў адных грашах, каб усё круцілася, а ў тым, каб утрымаць гэта для наступных пакаленняў. Каб традыцыя, культура і іншыя каштоўнасці, якія гінуць у нашым свеце, захаваліся. Пытаюцца часам у нас: чаму не размаўляеце татарску? Мы тут ад 600 гадоў, 300 гадоў таму кароль Польшчы забараніў нам карыстацца нашай мовай пасля славутага бунту... А як сябе адчуваю перад экскурсіямі, якія шукаюць экзотыку? Я адчуваю сябе сама сабой, так як і мае сябры, знаёмыя, усе, хто са мной.

У саміх Крушынянах пастаянна жыве толькі дзве татарскія сям'і — шматпакаленневая сям'я Халецкіх і старэнькая ўдавіца Ева Паплаўская. Выходзім з разгулянага татарскага падворка знаёміцца з рэштай насельніцтва святочна аціхлых Крушынян — сёння праваслаўнае свята Спаса.

(працяг у наступным нумары)

Міра ЛУКША
Рэната ЧЫЖЭЎСКАЯ

Міхал-Мухарэм Адамовіч, Джанэта Багдановіч і Рэната Чыжэўская пры татарскай кухні

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Да Багдановічаў горнуцца маладыя

Дварышча Сапегаў у Дубне

З пачаткам жніўня г.г. каля вёскі Дубна, што каля Боцькаў, пачаліся археалагічныя раскопкі на месцы феадальнага дварышча Сапегаў. Дварышча размяшчалася каля кіламетра на поўнач ад сённяшняй вёскі. Адзін з пачынальнікаў магутнага магнацкага роду Вялікага княства Літоўскага Іван Сапега, які ў 1508 годзе стаў віцебскім ваяводам, а ў 1514 — падляшскім, у 1509 годзе за паспяховую дзяржаўную службу атрымаў Боцькі, а ў 1512 годзе ўзяў ад суседзяў Дубна ўзамен за далейшыя вёскі, м.інш. Наройкі. Нашчадкі Іванавага адгалінавання роду таксама станавіліся важнымі дзяржаўнымі тузамі: сын Івана Павел быў з 1556 года падляшскім ваяводам, а з 1558 — навагрудскім, унук Мікалай быў ваяводам мінскім, брэсцкім і віцебскім, унук Багдан — ваяводам мінскім, унук Андрэй — ваяводам полацкім і смаленскім, праўнук Мікалай — ваяводам мінскім і брэсцкім... І гэтыя магнаты пакінулі пасля сябе не толькі архіўныя запісы.

Як сказала мне Галіна Карвоўская з Археалагічнай майстэрні Падляшскага музея ў Беластоку, раскопкі маюць за мэту праверку здагадак, што на згаданым месцы ў палове XVII ст. нешта існавала. Даследаванне архіўных дакументаў дазваляе меркаваць, што ў абсягу дубнянскага дварышча найважнейшымі аб'ектамі былі дзве мураваныя камяніцы, малая і вялікая; абедзве з падваламі. Былі яшчэ м.інш. капліца, карчма, лямус і кузня, якая, мабыць, працавала на мясцовай балотнай рудзе.

Да часу раскопак былі праведзены ранейшыя даследаванні месца не толькі ў пісьмовых архівах. Археалагічную разведку падмацоўваюць і істотна ўзбагачаюць інфармацыямі пра мясцовае асяроддзе і геамарфолагі, якія дапамаглі лакалізаваць камяніцы. На восені мінулага года былі выкананы свідраванні грунту, у выніку былі зафіксаваны фрагменты муроў. Дарэчы, працы пачынаюцца ў жніўні, тады, калі з'яўляецца пожня, якая адкрывае ход на сітуаваныя сярод абсеяных палёў археалагічныя пляцоўкі. Сёння яны пад купінамі дрэў, якія выраслі там таму, што фундаментаў не ўдалося разараць пазнейшым земляробам. Захаваліся тры такія купіны: пад адной з іх — пад якой найраней пачаліся раскопкі — адкрыты фундаменты малой камяніцы; на месцы другой купіны была вялікая камяніца; на месцы трэцяй маглі быць гаспадарчыя і жылыя збудаванні фальварка. Гэтыя аб'екты даволі ад сябе адлеглыя, што дазваляе меркаваць пра размах планіроўкі дварышча.

У першыя дні раскопак, калі я быў на месцы, адкрыты былі не толькі фундаменты малой камяніцы. Знойдзена было таксама шмат гербавай кафлі Сапегаў, што дапаможа ўстанавіць чарговых уладальнікаў Дубна. Знойдзеная бутэлька са штэмпелямі, паказвае, што ўладальнікі завозілі піва з Лондана. Раскапаны фрагменты бытавой керамікі, кавалкі шкла з акон са свінцовымі Т-профільнымі рамамі. У далейшым плане намячаліся раскопкі вялікай камяніцы і ацэнка кубатуры паасобных аб'ектаў. Дарэчы, раскопкі намечаны на гады, сёлета толькі пачатак вялікай працы. Але ўжо на восені г.г. Падляшскі музей хоча наладзіць у Боцьках выставу знойдзенага матэрыялу.

Даследаванне дварышча Сапегаў у Дубне праводзіцца ў рамках еўрасаюзнага праекта Interreg IIIA Польшча — Беларусь — Украіна. У гэтым праекце ўдзельнічаюць з польскага боку Падляшскі музей і Інстытут археалогіі Лодзінскага універсітэта, а з беларускага Гродзенскі дзяржаўны гістарычна-археалагічны музей і Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы. У раскопках удзельнічалі студэнты не толькі з Беларусі і Польшчы, але таксама студэнты з іспанскай Галісіі, якія прабывалі на стыпендыі ў Лодзінскім універсітэце.

Сяргей Піваварчык з Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы сказаў мне, што да ўдзелу ў супольных працах да беларускіх вучоных звярнуліся іх польскія калегі. Гэта не толькі ўзбуйніла шанс атрымаць еўрасаюзныя сродкі, але таксама ўзбагаціла археалагічную разведку мясцовай даўніны істотнай дапамогай з Беларусі. Бо шмат дакументаў кранаючых падляшскую даўніну захоўваецца ў беларускіх архівальных установах, а гэта дазволіць далучыць пісьмовыя крыніцы да археалагічных. Вельмі важны таксама абмен вопытам, бо археалагічныя аб'екты розныя — гэта ж і гарадзішчы, і селішчы, і могілкі. І яны дазваляюць комплексна, усебакова, больш шырока глянуць на наша супольнае мінулае. І самі студэнты пры такой нагодзе набываюць не толькі археалагічны вопыт.

Што сталася з дваром Сапегаў у Дубне, чаму ён не вытрымаў выпрабавання часу, мне на месцы яшчэ не ўдалося даведацца. XVI стагоддзе і першая палова XVII на захадзе Вялікага княства Літоўскага характарызаваліся агульным уздымам феадальнай гаспадаркі. Феадалы імкнуліся да стварэння ў сваіх уладаннях паселішчаў местачковага характару з гандлёва-рамесніцкімі функцыямі. І Сапегі размахнуліся шырокім крылом, мабыць занадта шырокім, каб усе іх задумы атрымалі далейшы ход. Круты ўздым роду выклікаў супрацьдзеянне іншых магнатаў і ў яго выніку палітычная магутнасць Сапегаў, а следам за ёю і эканамічная, пайшлі на спад; апошняй тэндэнцыі паспрыялі таксама шматлікія войны, якія ў той час пракаціліся па Вялікім княстве Літоўскім, не абмінаючы і ўладанняў Сапегаў. І ў гэтым плане Дубну пазней папросту не пашанцавала.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Раскопкі ў Дубне

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Ён вершам гаварыў

У Арлянскай гміне ёсць народныя калектывы і шмат майстроў народнага рукадзелля, так як амаль у кожнай іншай гміне. Але Арлянская гміна мела таксама свайго паэта; мела, але ўжо з 12 ліпеня г.г. яго няма ў жывых. І вельмі шкада, бо быў ён незвычайным чалавекам не толькі таму, што пісаў рыфмай і дэкламаваў, але і таму, што быў вельмі жыццерадасным, сардэчным, вясёлым, ветлівым і адважным ды адначасна вельмі скромным і ціхім, калі ў той жа час вакол штораз больш людзей панылых, заўзятых і зларадных. І ў Арлянскай гміне не будзе ўжо тае рэдкае радасці, якая ахоплівала людзей на народных фэстах, калі на сцэну выходзіў Андрэй Грайко з калёніі Пашкоўшчына. Народны паэт у апошні раз выступіў на мінулагоднім фэсце ў Орлі.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

26 чэрвеня 2005 года на фэсце ў Орлі Андрэй Грайко выступіў з вершам апошні раз

Народжаны 31 сакавіка 1925 года Андрэй Грайко свае дасціпныя вершы ведаў на памяць і дэкламаваў іх не толькі на мясцовых народных фэстах, але часта ездзіў і выступаў з вершаваным словам разам з калектывам „Арляне" на сходах, сустрэчах з сялянамі, нават на пункце скупкі. Людзі слухалі, смяяліся, ківалі галовамі, і ўсім рабілася неяк лягчэй на душы, прыгнечанай цяжкім жыццём.

Успамінаў мне ў 1997 годзе сам Андрэй Грайко, што калі ён быў купіў сабе трактар „Владимирец", то ў вёсцы пачалі некаторыя падсмейвацца і гаварыць: „Грайко ўжо вершаў не піша, бо трактарам арэ". Раней працаваў ён толькі з канём.

— Гэта няпраўда, — каменціраваў ён, — я пішу і ў час працы, якая дазваляе думаць і тады, калі думкі прыходзяць лёгка, найлепш раніцай. Як толькі такая думка вырысоўваецца, яе зараз трэба запісаць у нататнік каб не забыць, — рассакрэціў ён мне сваю простую паэтычную ісціну.

Калі зараз пытаю жыхароў Орлі, ці зналі яны Грайко, яны адразу адказваюць:

— Як жа ж не? Ён вершыкі гаварыў.

Андрэй Грайко абрабляў гаспадарку, а паэтам ён стаў саматужна. Быў ён, так як Сымон-музыка, мастацкім самавукам, вельмі здольным, але народжаным у неспрыяльны самародным талентам час.

— Ён выдатна вучыўся ў пачатковай школе, на самых пяцёрках і чацвёрках. Чаму бацькі не паслалі яго вучыцца далей? — шкадуе Ніна Мінцэвіч, мая мама, якая была аднакласніцай Андрэя Грайко.

Паэт жыў на хутары, да якога да 1977 года не была праведзена электрычнасць. Гэтую праблему, як і шмат іншых, ён вырашыў пры дапамозе рыфмаванага слова. Мабыць і адсутнасць электрычнасці паўплывала на працяглае пісанне вершаў. Яны хвалявалі вясковае асяроддзе. Пісаў ён пра свой хутар, пра Пашкоўшчыну і Тапчыкалы, пра іх жыхароў, пра дарогі. Вершы Андрэя Грайко карысталіся вялікай папулярнасцю не толькі сярод мясцовага насельніцтва. На жаль, як мне вядома, не паказаліся яны друкам у кніжачцы. Думаю, што цяпер, калі не стала аўтара, гэта доўг...

21 мая 2002 года, у свята Іаана Багаслова, паэт з Пашкоўшчыны вітаў перад арлянскай царквой уладыку Саву.

Апошні раз у сваім жыцці Андрэй Грайко выступіў перад публікай на народным фэсце ў Орлі 26 чэрвеня 2005 года, дэкламуючы вясёлы жыццёвы верш „Пра Яна ў Пасынках". У палове верша ён спыніўся і змоўк, быццам забыўшы далейшы змест. Секунды здаліся быць мінутамі, публіка ўстрывожылася. Я ведаў, што падстаў для трывогі не было, бо паэт заўсёды добра помніў змест сваіх вершаў. А ён быццам захацеў інакш паказацца людзям, быццам прадчуваючы блізкае немінучае. Але свае думкі захаваў ён сабе. Закончыў верш, а публіка ўзнагародзіла яго бурнымі бравамі.

Гаворыцца, што не жыў той, хто пасля сябе не пакінуў добрых успамінаў. Гаворыцца, што чалавек жыве датуль, пакуль жыве памяць аб ім. У Арлянскай гміне Андрэй Грайко надоўга астанецца жывым.

Міхал МІНЦЭВІЧ

http://za-svabodu.org

Барацьба за дэмакратычныя пераўтварэнні ў Беларусі ўсё больш набывае рамантычнае апірышча. Віртуальная прастора дазваляе ўвасобіць гэты рамантызм, прыдаць яму непераходную перавагу перад бляклай сучаснасцю чыноўніцкага ўсеўладдзя, што пануе ў лукашэнкаўскай Беларусі. Такую адметнасць цяперашняга этапу палітычнай барацьбы ў беларускім грамадскім жыцці можна добра пабачыць, калі зайсці на сайт, што месціцца па адрасе http://za-svabodu.org.

Даны інтэрнэтны партал — віртуальнае адлюстраванне кампаніі „За свабоду", якая перманентна праходзіць у Беларусі, актывізуючыся падчас палітычна значных падзей, такіх як выбары альбо ўгодкі незалежнасці краіны. На сайце пераважваюць белыя, чырвоныя і блакітныя колеры, якія перадаюць зайшоўшаму на яго інтэрнаўту настрой змагання і нейкай чысціні. Лагатып „За свабоду", якім характарызуецца грамадзянская кампанія, змешчаны ў левым верхнім вугле выяўлення і ўвасабляе сабой птушку, галава і тулава якой складаюцца з літар назвы акцыі.

Сайт падзелены на традыцыйныя тры часткі. Праўда, па памеры яны адрозніваюцца ад мноства іншых сайтаў падобнай грамадска-палітычнай накіраванасці. Левая частка займае амаль палову выяўлення і аддадзена пад рознага кшталту навінныя паведамленні. Для грамадзянскай кампаніі гэта цалкам апраўдана, бо тут найважнейшым ёсць паведаміць людзям аб тых падзеях, якія праходзяць у рамках гэтага дзеяння ці маюць да яго нейкае дачыненне.

Паколькі лагатып птушкі „За свабоду" з'яўляецца адным з галоўных чыннікаў у пазіцыяніраванні цэлай кампаніі, то для яе арганізатараў вельмі важна, каб жадаючыя маглі нейкім чынам атрымаць налепкі з даным лагатыпам. Такую магчымасць прадастаўляе сярэдняя, вузейшая частка выяўлення, дзе прапануецца спампаваць выявы як налепак, так і значкоў са „свабоднай птушкай".

Не забыліся распрацоўшчыкі сайта і аб тых, хто пацярпеў, змагаючыся за дэмакратычныя пераўтварэнні ў Беларусі і цяпер знаходзіцца за кратамі лукашэнкаўскіх турмаў. На сайце размешчаны здымкі двух актывістаў грамадскай арганізацыі „Партнэрства", суд над якімі адбыўся ў першай палове жніўня.

Трэцяя частка аддадзеная пад артыкулы з іншых сайтаў. Даныя артыкулы, па меркаванню распрацоўшчыкаў, вартыя для азнаямлення, таму яны палічылі мэтазгодным папулярызаваць іх праз уласны партал.

Трэба адзначыць, што на сайце багата рубрык. Але выйсці на іх знаходзяцца толькі ўверсе пад лагатыпам і таму не адразу кідаюцца ў вочы. Ну а калі ўсё ж звернеш на іх увагу, то прага да свабоды там яскрава прасочваецца нават у назвах рубрык — „Стратэгія свабоды", „Песні свабоды", „Пра свабоду".

Каб болей даведацца пра кампанію, варта зазірнуць на старонку „Пра нас", дзе распавядаецца чаго хочуць яе ініцыятары. „Мы дзейнічаем для таго, каб кожны хто верыць, што Свабода — гэта падставовая каштоўнасць, змог бы праявіць сябе свабодным чалавекам, — запэўніваюць яны. — Мы нікога нікуды не «запісываем» і не навязваем кіраўніцтва, а замест гэтага прапануем веды, матэрыялы і ідэі".

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Чарговая „карона" КК

Беларускія весляры настолькі прывучылі да гучных перамог на самых буйных міжнародных спаборніцтвах, што прысутнасць іх на п'едэсталах успрымаецца як належнае і нават непазбежнае. Айчынная школа веславання з году ў год даказвае, што яна ёсць адной з самых мацнейшых у свеце. Пацвердзіла гэта і першынство планеты, якое прайшло ў венгерскім горадзе Сегед. На ім не было роўных гаспадарам канала, якія заваявалі ажно 18 медалёў (з іх 12 залатых). Папраўдзе такое выразнае дамінаванне адной дружыны ў кожным відзе спорту заўсёды выклікае падазрэнне (зважаючы на тое, што жывём у час татальнай фармакалогіі і частага ўжывання допінгу). Належную канкурэнцыю венграм склала Нямеччына — 15 узнагарод. Далей размясціліся Расія і Польшча — па 6, Беларусь — 5, Канада, Украіна і Кітай — па 4. Усяго ж у прызёры выбіліся прадстаўнікі 21 краіны з чатырох кантынентаў (узялі ўдзел весляры з 81 дзяржавы).

У беларускай камандзе галоўнымі героямі стаў квартэт маладых весляроў на каноэ — Дзмітрый Рабчанка, Дзмітрый Вайцішкін, Канстанцін Шчарбак і Аляксандр Ваўчэцкі выйгралі дыстанцыю 500 метраў (летась наша чацвёрка заняла другое месца ў гэтай намінацыі). На гэтым хлопцы не супакоіліся і ў апошні дзень спаборніцтваў здабылі срэбра на 200 метрах, мізэрна саступіўшы чэшскаму экіпажу. На рахунку беларускіх прадстаўнікоў таксама тры бронзавыя медалі. Яшчэ адна чацвёрка на чале з дасведчаным Аляксандрам Курляндчыкам (у яе складзе былі таксама Аляксандр Жукоўскі, браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы) на кіламетровай дыстанцыі, як кажуць, „на зубах" вырвала медаль у польскай каманды. Чакалі поспеху яшчэ ад аднаго спрактыкаванага нашага калектыву. І ён па вялікаму рахунку не падвёў. Раман Петрушэнка, Аляксей Абалмасаў, Дзям'ян Турчын і Вадзім Махнеў сталі трэцімі на экіпажнай байдарцы ў заездзе на 1 000 метраў. Гэты ж склад у фінале на 200-метроўцы заняў 9-е месца па прыкрай прычыне — на старце зламалася адно вясло. Бронзавым прызёрам афінскай алімпіяды Петрушэнку і Махневу на байдарцы-двойцы на гэты раз зусім крыху забракла да п'едэстала на 500-метровай адлегласці — 4-е месца. А вось жаночы дуэт — Ганна Пучкова-Арэшка і Наталля Бандарэнка — здзейсніў маленькі сюрпрыз, заняўшы трэцяе месца на байдарцы-двойцы на кіламетровым адрэзку. Адзначым, што ў адрозненне ад мужчын, сур'ёзных поспехаў беларусак у веславанні на байдарках і каноэ сапраўды зачакаліся. І вось прыйшоў сур'ёзны поспех.

А ў акадэмічным веславанні не згасае яркая зорка КК — Кацярыны Карстан, якая хіба вартая тытулу „мацнейшая спартоўка Беларусі суверэннага часу". Нездарма ў свеце яе называюць Кацярына Вялікая. Ураджэнка вёскі Асечана, што ў Крупскім раёне Мінскай вобласці, Каця Хадатовіч ужо даўно, выйшаўшы замуж за немца, жыве за мяжой, але працягвае прыносіць славу беларускаму спорту. Днямі на чэмпіянаце свету, што прайшоў у брытанскім Ітане, двухразовая алімпійская чэмпіёнка атрымала чарговую „карону" на сваёй улюбёнай дыстанцыі 2 000 метраў.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Звыклая тузаніна

Ёсць дзве тэмы на Беларусі, якія ўжо за дванаццаць гадоў так абрыдлі, што ў звычайнага грамадзяніна выпрацаваўся моцны рэфлекс не ўспрымаць іх так, як да нас хочуць тыя тэмы давесці дзяржаўныя прапагандысты. Папросту не слухаць, не чуць і не бачыць гэтых праблем у такім кантэксце, як падаецца ў афіцыйных медыях. Гэтыя тэмы — кошты на газ і інтэграцыя з Расіяй. Прычым, як бы не стараліся кіруючыя структуры Расіі і Беларусі сцвярджаць, што гэта асобныя аспекты і не тычацца адзін аднаго (маўляў, тэма коштаў на газ ляжыць у эканамічнай плоскасці, а інтэграцыя — гэта гістарычная неабходнасць), простыя людзі толькі пасмейваюцца з тых сцвярджэнняў. І самае смешнае тут тое, што кіруючыя структуры дзвюх суседніх краін увесь час намагаюцца, каб іхныя грамадзяне не атаясамлівалі гэтай газава-інтэграцыйнай вайны з палітыкай. А тыя, людзі іх краін, і не збіраюцца нават параўноўваць гэтага ні з якой палітыкай. І думаць так не ўмеюць. Яны лічаць, што гэта вайна за выжыванне і ўплывы беларускіх ды расійскіх кіруючых элітаў. А калі ў спрошчаным варыянце, то Пуціна і Лукашэнкі. І ніякай палітыкі тут няма, гэтак жа як і гістарычнай неабходнасці, і эканамічнай мэтазгоднасці.

Самыя ўжывальныя, такія „магічныя", можна сказаць, словы, якія найчасцей мусоляцца ў беларуска-расійскіх спрэчках кожным з бакоў, каб даказаць правільнасць менавіта сваёй версіі ўсходнеславянскага супрацоўніцтва, гэта словы „палітычная стабільнасць". Прытым беларускія і расійскія прадстаўнікі ўлад прыдумалі сваё значэнне гэтай фразе. Трошкі не такое, як ва ўсім свеце. Бо, прыкладам, у Еўропе пад палітычнай стабільнасцю разумеюць сістэму бяскроўнай, справядлівай, дэмакратычнай перадачы ўлады. А тут, палітычная стабільнасць азначае захаванне ўлады ў руках тых, у каго яна ёсць зараз. Ды вось бяда! З такой трактоўкай разумення палітычнай стабільнасці хутка, або некалі, а можа і зараз могуць не пагадзіцца іншыя палітычныя ці эканамічныя сілы, а можа і цэлы народ. Што тады? З так званымі іншымі палітычнымі і эканамічнымі сіламі ўсё зразумела. Іх можна дубасіць, арыштоўваць, зачыняць іхны бізнес і палітычныя структуры. Можна прыціснуць так, што і не вяўкнуць. А калі нешта і прапішчаць, то ўсё адно ніхто не пачуе. Цяжэй з народам. Яго ўсяго не разгоніш, бо тады не будзе кім кіраваць. Вось каб з тым народам праблем не было і патрэбная тая газава-інтэграцыйная валакіта.

Але якраз у гэтым пытанні такія адзіныя і маналітныя інтарэсы беларускіх і расійскіх кіруючых элітаў пачынаюць разыходзіцца. Што Пуцін можа паказаць свайму народу ў якасці дасягнення свайго кіраўніцтва Расіяй? Чачэнскую вайну? А можа стабільнае і нарастаючае пагаршэнне адносін з цывілізаваным светам? Наўрад ці расійскі народ будзе з таго шчаслівы. Застаецца апошні ход. Згуляць на імперскай хваробе рускіх, якую ім пакінула ў спадчыну царыца Кацярына і ўзмацнілі савецкія „фараоны", і далучыць да Расіі Беларусь. Маўляў, зямлі ў Расіі было мала, а цяпер пабольшала. Гэта так прымітыўна, што можа і спрацаваць.

Але гэта зусім не прыносіць аніякіх дывідэндаў беларускай наменклатуры. Хто тады яны, калі Беларусі не стане як незалежнай дзяржавы? Рускія хутка знойдуць ім замену. Ніякіх жа гарантый ад расійскага кіраўніцтва няма. А калі і будуць, то хто ім стане верыць. З іншага боку яны (сённяшняя беларуская ўлада, а не беларускі народ) без расійскага таннага газу таксама не могуць, бо беларускі грамадзянін можа па-свойму ўспрыняць падвышэнне коштаў і, адпаведна, не пагадзіцца з уладамі ў трактоўцы фразы „палітычная стабільнасць".

Вось і пачынаецца новая тузаніна „сяброў аж да труны", „братоў-славянаў", як заўсёды перад выбарамі ў Беларусі. Цяпер у мясцовыя саветы. Расійская наменклатура хоча Беларусь, а беларуская — танны газ. Гандаль доўжыцца. Пытанне толькі ў тым, хто каму колькі саступіць.

Пасля апошняй асабістай размовы Лукашэнка і Пуцін выйшлі з пакою вельмі пахмурнымі. Расійскія газавыя структуры паспяшаліся заявіць, што кошты для беларусаў на газ падымуцца ў тры разы. Беларускае кіраўніцтва паранейшаму заяўляе, што гатовае да інтэграцыі з Расіяй больш чым тая, толькі збіраецца пры гэтым захаваць суверэнітэт. А дзяржсакратар так званай саюзнай дзяржавы Павел Барадзін сказаў, што да канца гэтага года можа адбыцца рэферэндум, а ў пачатку наступнага — выбары ў саюзны парламент.

Беларускі ж грамадзянін, той самы, які не бачыць у тых інтэграцыях ні палітычнага аспекту, ні эканамічнай мэтазгоднасці, ні гістарычнай патрэбы гаворыць, што ўсё гэта ўжо чуў шмат разоў раней. А значыць, ніякіх істотных змен, як гэта ўжо не раз было, не прадбачыцца.

Віктар САЗОНАЎ

Бязвінныя грэшнікі

Наведаў мяне Уладзімір Герасімюк ды расказаў, як праходзіла камісія ў ЗУСе, якая 11 ліпеня г.г. абследвала стан ягонага здароўя.

— Прызначылі мне першую групу інваліднасці, — гаворыць сямідзесяцігадовы пенсіянер з Сухавольцаў. — Не ведаю, цешыцца ці плакаць. У мінулым годзе, калі я падаўся на такую ж камісію, дык заяву адкінулі. Аргументавалі, што магу самастойна існаваць. У цяперашнім заключэнні № 290964 ад 11 ліпеня лекар-эксперт у абгрунтаванні запісала: „Konieczność długotrwałej pomocy innych osób w zaspokojeniu podstawowych potrzeb życiowych". Разумею, што на рашэнне „няздольны да самастойнага існавання" безумоўна паўплывала кровазліццё ды параліч ног, затым шпіталізацыя на неўралагічным аддзяленні ў Харошчы, якую я праходзіў у гэтым годзе. А што было прычынай хваробы? Ці ж не вынік паслядоўнасцей здарэння, якое адбылося 21 лістапада мінулага года (чытайце: „У ЗУСе б'юць", „Ніва" № 28 ад 9 ліпеня 2006 г.). На маю думку — так. Але да гэтага бязвінныя грэшнікі Беластоцкага ЗУСу ніколі не прызнаюцца. Сведчыць за тым факт, што па сённяшні дзень ніхто з фірмы не папрасіў у мяне прабачэння. А мо лічаць мяне віноўнікам у гэтай скандальнай падзеі? Дык няхай прад'яўляць доказы майго злачынства. Мне стала вядомым, што паліцыя не праводзіла ў гэтай справе следства, бо ЗУС не прад'явіў заявы на гэтую акалічнасць. Аб гэтым сведчыць рашэнне Беластоцкай пракуратуры аб спыненні супраць мяне справы.

— У маім адчуванні ўчынак ахоўнікаў з'яўляецца ні чым іншым, як самасудам на маёй асобе. Па сённяшні дзень нашу ў сэрцы крыўду да чыноўнікаў страхавой фірмы за тое, што так нялюдска са мною абышліся, — з сумам дадае мой субяседнік. — І яшчэ мяне забалела тое, што пачуў на камісіі. Пры заканчэнні абследвання лекарка нібыта выпадкова заявіла: „Dam panu tę podwyżkę..." Успрыняў я гэтыя словы быццам міласціну з яе боку. А я ж не жабрак. Прашу тое, што мне законна належыцца. У маім заяўленні сямейная лекар падрабязна зрабіла выпіску з карт шпітальнага лячэння. Там чорным па белым было запісана: прычына хваробы, час і месца шпіталізацыі, вынікі шпітальных абследаванняў, як і прагноз далейшага лячэння. Усё запісана на аснове дакументаў. Ніякай фікцыі. І яшчэ адна дэталь: да мінулага года не здарылася мне траціць прытомнасць. Я не ведаў што такое боль галавы і якія паслядоўнасці нясе з сабою высокі ціск крыві. Выявіў гэта ўпершыню лекар хуткай дапамогі, якую вымушаны быў я выклікаць увечары пасля пабояў ахоўнікамі, г.зн. 21 лістапада мінулага года, затым у шпіталі ў Харошчы, куды я трапіў 30 сакавіка г.г. і прабываў там да 11 красавіка. Лекар-эксперт у заключэнні напісаў: „Дата ўзнікнення няздольнасці да самастойнага існавання: 30.03.2006 г." (на пятым месяцы пасля пабояў). Гэтыя факты гавораць самі за сябе.

— Ці рашэнне ЗУСаўскай камісіі лічыце канчатковым вырашэннем справы? — пытаю пенсіянера з Сухавольцаў.

— Не думаю складваць рук. Буду хадайнічаць за тым, каб ахоўнікаў прыцягнулі да адказнасці. На маю думку, кожны павінен атрымаць тое, на што заслужыў. Закон абавязвае ўсіх аднолькава, як грамадзяніна, так і дзяржаўнага чыноўніка.

Уладзімір СІДАРУК

Абсурды мінулага часу

Калі ўспамінаю мінулае, дык чамусьці прыгадваецца тое, як за каўбаскай у Варшаву мы ездзілі. Збіралася нас, чыгуначнікаў, пяць-дзесяць чалавек ды на цягніку (папулярным „варшавяку") — гайда ў сталіцу! Закупку найчасцей рабілі на вуліцы Бжэскай, непадалёк базару Ружыцкага. Амаль кожны купляў не менш як 10-15 кг каўбаскі „віленскай" — смакавітай і таннай, па 44 зл. за кілаграм. Праўда, прыходзілася ў чарзе пастаяць ды наслухацца непрыемных выказванняў так прадаўцоў, як і гараджан, напрыклад: „Вунь, вёха прыехала", або „Такім то жывецца, хлоп спіць, а яму расце". Нягледзячы на з'едлівасць гэтых заяў, мы рабілі закупку і гэтым жа „варшавякам" на адвячорку вярталіся дамоў. У кампаніі прыемна праводзілі час, гуляючы ў карты ды папіваючы піўцо. Але скончыліся добрыя часы і прыйшлося абмежаваць спажыцтво смакавітых каўбасак. З'явіліся картачкі на харчовыя прадукты ды пачалася рэгламентацыя прамысловых тавараў. Кухоннага посуду нельга было купіць без прад'яўлення талонаў за здадзеную макулатуру або другасную сыравіну. Каб купіць кухонную або пакаёвую мэблю, пральную машыну, тэлевізар, трэба было „мець плечы" ў высокапастаўленых чыноўнікаў. Размеркаваннем тавараў займаўся тады начальнік гміны ды прэзас ГС. Мне спатрэбіліся былі новыя фіранкі, заслоны і дыван для абсталявання пакоя. Паколькі я не меў шанцу аформіць справу з мясцовымі начальнікамі, дык паслаў заяву ваяводу. У абгрунтаванні заявіў, што я, як інвалід, не магу па начах стаяць у чарзе. Гэта было ў кастрычніку 1983 года. На аснове службовага пісьма з Аддзялення гандлю Ваяводскай управы, якое было дасланае ў Ваяводскае праўленне гмінных кааператываў, я змог купіць патрэбныя тавары ў мясцовай краме кляшчэлеўскага ГСа. Але не адзіны гэта парадокс тадышняй улады.

Купіў я перад Калядамі ў знаёмага калегі ў Чаромсе-вёсцы вепручка. Сябрук закалоў яго ды прывёз гатовае мяса дахаты. Выпілі барыш у мяне на кватэры. Калі я падрыхтаваў каўбаску для вэнджання, прыехаў вечарам міліцыянер і патрабаваў ехаць з ім на пастарунак. Не ведаючы ў чым справа, я паддаўся волі міліцыянера.

Функцыянер абвінаваціў мяне ў тым, што я без дазволу купіў свінчо, за што вымушаны буду пацярпець кару. Абышліся са мною як са злачынцам: склалі пратакол, узялі адбіткі пальцаў і перадалі справу ў гайнаўскую пракуратуру. Рашэннем вышэйзгаданай установы ад 13 лютага 1987 года мяне паведамілі „o warunkowym umorzeniu postępowania karnego" і неабходнасці заплаціць 10 000 зл. на дабрачынныя мэты. У пракуратуры мне аднак падказалі напісаць прашэнне на паніжэнне кары. Я падаў адпаведную заяву. Канчаткова зменшылі кару напалову. Пяць тысяч злотых заплаціў я на Грамадскі камітэт разбудовы Пачатковай школы № 2 у Гайнаўцы. Хачу дадаць, што падобных здарэнняў было тады ў Чаромсе пад дваццаць. Гэта быў вынік даносаў мясцовых сышчыкаў.

Паказаныя прыклады лічу парадоксам і анамаліяй, але на такіх парадоксах існавала тадышняя рэчаіснасць.

(ус)

Размова з Мікалаем ГРЭСЕМ — рэдактарам штомесячніка „Газета Міхалова і ваколіц"

— Як далёка даходзіць „Газета Міхалова і ваколіц"?

— Да ваколіц, так як у назве газеты, але не толькі Міхалоўскай гміны, але Нараўкі ці Заблудава. А, пэўна, і да Гарадоцкай гміны, хоць там маюць „Гарадоцкія навіны". Апрача таго высылаем яе нашым суайчыннікам, якія выехалі ў Бельгію, Англію, ЗША, Канаду. Жыхары Беластока таксама купляюць. Тыраж „Газеты" — 700 экземпляраў. Уся яна польскамоўная. Успамагаюць „Газету" аўтары „Czasopisa", а тэхнічным рэдактарам з'яўляецца Юры Хмялеўскі, галоўны рэдактар „Czasopisa" і „Гарадоцкіх навін".

— Хто фінансуе выдаванне „Газеты"?

— Часам спонсары, а наогул гміна.

— Калі пішае праўду ў „Газеце", то што на гэта ўлада гміны?

— Нічога. Не кіруе намі, і не гаворыць аб чым пісаць. А нават ёсць удзячная за крытычныя публікацыі, якія выяўляюць недахопы.

— Ці ў Міхалоўскай гміне ёсць беспрацоўе?

— Няма. А калі ёсць, дык статыстыкі не адлюстроўваюць. Як на невялікую гміну маем многа інвестыцый. Неўзабаве будзе адкрыта фабрыка.

— Як з заможнасцю жыхароў?

— Узровень багацця больш чым сярэдні. Усе мясцовасці маюць водаправоды.

— Як з турызмам?

— Дзейнічае Агратурыстычнае таварыства „Крэсы". Гміна паставіла на турызм. Пашыраецца турыстычная інфармацыя так у гміне, як і ў Інтэрнэце: www.michalowo.ug.gov.pl. Паўстаюць агратурыстычныя кватэры ў Міхалове і на вёсках. Праз гміну пралягае веласіпедная сцежка ад Каралёвага Моста да Ялоўкі даўжынёю 75 км.

— Ці школы дзейнічаюць толькі ў Міхалове?

— Апрача Комплексу школ у Міхалове працуюць яшчэ дзве: у Шымках і Новай Волі.

— Як гмінны бюджэт успамагае газаправод, які ляжыць у Міхалоўскай зямлі?

— У памеры 30%.

— Дзякую за размову.

Гутарыў Міхась КУПТЭЛЬ

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор і карэктура: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na IV kwartał 2006 r. upływa 5 września 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2006 r. wynosi 28,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 49,00 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 70,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 72,80). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 84,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 93,80), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 109,20), Australia — 10,00 (kwart. — 140,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.
Nakład: 1000 egz.

Анатоль ПАРЭМБСКІ
жнівень 2006 г.

Век беларусаў

Каму мы што злога зрабілі?
Нас ганяюць сюды ды туды.
Усе вякі для чужынцаў служылі
Не з ахвоты — з няволі, бяды.

Гналі ў бежанства нас у Расію
Падчас першай сусветнай вайны,
А вяртацца памоч на радзіму
Не хацелі цары ні паны.

І санацыя нас выціскала
Са прадвечна нам роднай зямлі,
Каланістаў сваіх насяляла,
Каб хутчэй нас спалячыць маглі.

І Сібір засяліла нямала
Непаслушнымі бальшавікам,
А вайна па франтах разаслала —
Тлеюць косці і сёння іх там.

А на Захадзе Картуз-Бяроза
Беларусам праклёнам была.
Колькі выцекла матчыных
слёзаў —
Не адна іх знясці не змагла.

Уладам мова наша была страхам,
Беларус — ні пісаць, ні чытаць.
Школа польская зманным
замахам
Пачала нас палякамі зваць.

Па вайне мы ўсім тут мяшалі.
Сталін гнаў у Савецкі Саюз.
Нарадоўцы ў „рай” выпраўлялі:
Выбірайся, бо будзе прымус!

Беларускія вёскі гарэлі.
Уцякайце, кацапы, у Маскву!
Таму толькі, што па-польску
гаварыць не ўмелі,
А маліцца хадзілі ў царкву.

Ды і сёння спакою не маем!
Шораз кіне фанатык заказ:
А нашто сваю „Ніву” чытаем?
Ці на фэстах замнога ўсіх нас?

З ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНАГА РУХУ НА БЕЛАСТОЧЧЫНЕ

Фота АРХІЎ НІВЫ

Анджэй Леппэр зрабіў разумна — паслухаўся Міры і ўжо зараз не мусіць сядзець за пустой талеркай на Беласточчыне.

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

У тры гадзіны ночы баба звоніць на хуткую дапамогу:

— Пан доктар, не магу заснуць. Ад пяці гадзін усё качаюся з аднаго боку на другі.

— Гэта не дзіва. Калі хочаце заснуць, тады трэба ляжаць спакойна.

У лекара:

— Пан доктар, не магу доўга заснуць.

— Запішу вам добрыя таблеткі; хопіць іх на цэлы месяц.

— Але ж я так доўга не хачу спаць.

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — афарызм Аскара Уайльда.

1. тупая частка сякеры, процілеглая лязу = 46 _ 19 _ 16 _ 45 _;
2. каштоўная папера, сведчанне паявага ўзносу ў прадпрыемства = 67 _ 68 _ 54 _ 53 _ 44 _;
3. адчуванне фізічнай або маральнай пакуты = 51 _ 34 _ 8 _ 22 _;
4. лейкападобны рух завіхранай вады = 58 _ 64 _ 60 _;
5. самка гусака = 35 _ 36 _ 69 _ 80 _;
6. вялікая вадаплаўная птушка з доўгай выгнутай шыяй = 49 _ 48 _ 52 _ 59 _ 10 _ 11 _ 18 _;
7. паліцыя ў краінах СНД = 1 _ 12 _ 3 _ 30 _ 21 _ 20 _ 7 _;
8. навейшыя фасоны ўбораў = 75 _ 76 _ 5 _ 4 _;
9. жыхар Берліна = 31 _ 32 _ 33 _ 74 _ 17 _;
10. спосаб бегу каня або драпежная жывёліна сямейства кашэчых = 42 _ 43 _ 39 _ 38 _;
11. асобная кніжка збору твораў = 66 _ 14 _ 63 _;
12. Паўла, украінскі паэт (1891-1967) = 40 _ 6 _ 15 _ 27 _ 26 _ 41 _;
13. навука аб уласцівасцях рэчываў і іх узаемных рэакцыях = 13 _ 29 _ 28 _ 50 _ 57 _;
14. абласны расійскі горад на верхняй Волзе = 37 _ 23 _ 24 _ 25 _;
15. гіганцкія разбуральныя хвалі ад падводнага землетрасення = 79 _ 78 _ 73 _ 72 _ 71 _ 65 _;
16. за кампанію павесіўся і сваю кабылу хваліць = 47 _ 62 _ 77 _ 2 _ 61 _;
17. кітайская грашовая адзінка = 9 _ 70 _ 56 _ 55 _.

(Ш)

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10
11	12	13	14	15	16	17	18	19	20
21	22	23	24	25	26	27	28	29	30
31	32	33	34	35	36	37	38	39	40
41	42	43	44	45	46	47	48	49	50
51	52	53	54	55	56	57	58	59	60
61	62	63	64	65	66	67	68	69	70
71	72	73	74	75	76	77	78	79	80

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 30 нумара

Анатоль, мох, кнот, ніць, ом, Грынкевіч, Ней, бор, дым, норма, геалогія, Піна, Вазаў, Тромсё, ватага, прыход.

Рашэнне: **Той хто нічога не робіць, мае заўсёды многа памагатых.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Міхалу Байко** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

03.09 – 09.09

Баран (21.03. — 19.04.) У інтарэсах слухай голасу інтуіцыі, не сяброў. Будзеш рабіць сабе прыемнасць, адпачываць. Будзеш дасціпны, энергічны. Ды 6.09. кончыцца раздолле, трэба брацца за работу!

Бык (20.04. — 20.05.) Можаш зрабіць некалькі добрых здзелак — маеш магічны ўплыў на контрагентаў! Лёгка закахацца ў кімсьці па вушы, ды як цяжка траціць свабоду! Прыемная атмасфера дома. З 6.09. дынамічны рух у тваіх справах.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Ахвота, каб выгарнуць шэфу, што ты аб ім думаеш; не нарабі сабе бяды! Хвіліны жарсных любоўных узлётаў ды і шарпаніны. З 7.09. магчымыя сваркі ў пары, падазронасць, недавер да сяброў. Не ляпні чаго лішняга.

Рак (22.06. — 22.07.) У кампанейскім рэйтынгу ты выразна перасоўваешся дапераду; вянок аматараў. Вельмі добрыя кантакты з людзьмі, аптымізм, добры настрой. Лёгка ідзе навука. 7.09. асцерагайся новых знаёмстваў, асабліва з чужаземцамі.

Леў (23.07. — 22.08.) Цяпер найважнейшы твой партнёр — ахвота прыхіліць яму неба. Доўга не раздумвай, калі атрымаеш прапанову новай працы. 5-9.09. можаш зрабіць інтарэсы свайго жыцця! Не падвядзе цябе ні інтуіцыя, ні шанцоўка.

Дзева (23.08. — 22.09.) Увесь месяц буры. Непаразуменні з партнёрам; кожнае схоча паставіць на сваім. Лепш паадпачывай, правядзі крыху часу ў самоце, займаючыся любімай справай. 6.09. можаш выплысці на шырокія воды. Ужо ў другім тыдні месяца шанцы падзарабіць.

Шалі (23.09. — 22.10.) Можаш справіцца з тым, што патрабуе моцнага заангажавання. Аддзеліш зерне ад паловы і засяродзішся на сапраўды важным. Будзеш баявіты і горды.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Усё можа змяніцца ў тваім жыцці (з 5.09.). Новыя шанцы, самаўпэўненасць. Справішся з фінансамі. З 7.09. не рабі нічога на цяп-ляп. У пары (увесь месяц!) поўна скандалаў, і на працы нервова; калі хочаш пазбегчы памылак, упарта адстойвай сваё.

Стралец (22.11. — 21.12.) Выдатны настрой. Гладка ўсё ідзе ў прафесійных справах, у школе. 6-10.09. непаладкі ў хаце; не пераймайся глупствамі. Сяброўства і бізнес не ідуць у пары.

Казярог (22.12. — 19.01.) Можаш сустрэць кагосьці, хто табе наканаваны і будзеш кахаць яго як нікога ў свеце! Прапанова працы за мяжой. Не будзь зарадыкальны ў жыццёвых зменах.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Можаш кожнага абматаць сабе вакол пальца, ды вялікага кахання прыйдзецца пачакаць. Прафесійны поспех будзе шмат каштаваць. 3-7.09. можаш быць рассеяны і нервовы. Не будзь бравурны і не думай, што ты беспамылковы. З 8.09. шмат запалу для рэалізацыі новых праектаў.

Рыбы (19.02. — 20.03.) 5-9.09. ніхто цябе не спыніць! Амаль усё давядзеш да шчаслівага фіналу. 7.09. благое самаадчуванне, нечаканыя падзеі, недахоп рэалістычнай самаацэнкі.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960